Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

№126 (28490)

5 ЛІПЕНЯ 2017 г. СЕРАДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

стар. 5–12

Чым уразіў Форум рэгіёнаў

МС

Лечым сэрца

СТАР. 13

Садовы каляндар на ліпень

СТАР. 16

ЦЫТАТА ДНЯ

Сяргей НАЛІВАЙКА, міністр па падатках і зборах:

«У сусветнай практыцы падаткам на багацце, раскошу абкладаюцца, як правіла, аб'екты нерухомасці. У нашай рэспубліцы ў дачыненні да такіх аб'ектаў выплачваюцца падатак на нерухомасць і зямельны падатак. Таму пытанне аб увядзенні падатку на багацце намі не разглядалася. Іншае пытанне — гэта вызначэнне справядлівага кошту, з якога робіцца вылічэнне падаткаў на маёмасць. Як паказвае міжнародны вопыт, падаткаабкладанне нерухомасці на аснове кадастравага кошту з'яўляецца найбольш прагрэсіўным і эфектыўным. Таму далейшае рэфармаванне сістэмы падаткаабкладання павінна прадугледжваць змяненне падыходаў да падаткаабкладання нерухомай маёмасці ў залежнасці ад каштоўнасці аб'екта нерухомасці».

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 5.07.2017 г.

Долар ЗША		1,9442 ▲
Еўра		2,2071 ▼
Рас. руб.		0,0328 ▲
Укр. грыўня		0,0746 ▲

ISSN 1990 - 763X

■ Святкуем!

Каб радасна было ўсім

Фота БЕЛТА.

Бабруйск у гэтыя дні адзначае 630-годдзе. Адным з мерапрыемстваў, прысвечаных памятнай гістарычнай падзеі, стала адкрыццё Маладзёжнага парку, размешчанага паміж Палацам мастацтваў і ГЦ «Карона». Гэта месца калісьці планавалі аддаць пад аквапарк, але пару гадоў таму па ініцыятыве Маладзёжнага парламента горада на пустыцы вырашылі стварыць парк.

Гараджане чакалі гэтай падзеі: у вялікім мікрараёне да гэтага не было ўтульнага сквера. У парку ўзвышаюцца круглая альтанка-ратонда, каланада, дзве аркі, ёсць фантан, лаўкі і веладарожкі. Сёння па парку гуляюць маладыя мамы з дзецьмі, ёсць месца для моладзі і бабруйчан старэйшага ўзросту. Зелянеюць маладыя дрэўцы — іх тут звыш 240, уздоўж дарожак кусты — іх у парку тры з лішнім тысячы.

■ Працяг тэмы

ТАКІХ МУЗЕЯЎ НАМ НЕ ХАПАЕ

У Магілёўскай вобласці на прыкладзе літаратурнага музея Максіма Гарэцкага ў Мсціслаўскім раёне абмеркавалі шляхі папулярызацыі падобных установ



Гэта адбылося ў рамках XXV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Гарэцкія чытанні». Беларускі пісьменнік, літаратуразнаўца, перакладчык, фальклярыст Максім Гарэцкі нарадзіўся ў 1893 годзе ў вёсцы Малая Багацькаўка на Мсціслаўшчыне. Яго ўклад у беларускую літаратуру неацэнны. «На імперыялістычнай вайне», «Дзве душы», «Камароўская хроніка» і іншыя яго творы ўвайшлі ў залаты фонд нашай літаратурнай спадчыны. А яшчэ ім створаны не менш значныя і цікавыя літаратурна-крытычныя і навуковыя працы. Ягоная «Гісторыя беларускай літаратуры» на працягу першага паслярэвалюцыйнага дзесяцігоддзя служыла адзіным падручнікам для сярэдняй і вышэйшай школы. Максімам Гарэцкім былі таксама падрыхтаваны і выдадзены «Хрэстаматыя беларускай літаратуры: XI стагоддзе — 1905 год», «Руска-беларускі слоўнік» і шмат чаго іншага. Нам застаецца толькі ганарыцца такім земляком і папулярызаваць яго творчасць. А з гэтым, на жаль, ёсць праблемы.

СТАР. 4

«ДЗЕ ХАЧУ, ТАМ І ПЛАВАЮ»

Канец мінулага працоўнага тыдня выдаўся ў Мінску спякотным. Ртутны слупок упэўнена перасягнуў адзнаку ў 30 градусаў па Цэльсіі. А значыць, да воднай прахалоды ў такое надвор'е пацягнуцца сотні адпачывальнікаў. Ці ўсе яны зважаюць на правілы бяспечных паводзін? За гэтым назіралі карэспандэнты «Звязды», якія выправіліся на Камсамольскае возера.

— Калі на вуліцы надвор'е спякотнае, то парушальнікі з'яўляюцца з самай раніцы, — кажа **начальнік выратавальнай станцыі «Камсамольскае возера» Дзяніс ЧАШУН.** — Сапраўдная «тэрмаядзерная» сумесь — цёплае надвор'е на выхадных. У будні ж зранку крыху цішэй: большасць жа людзей працуе па графіку 5/2.

Тры гады таму Таварыства ратавання на водах пачало патруляваць акваторыю возера з міліцыянерамі. Далёка не ўсе адпачывальнікі ўсведамляюць, што, купаючыся ў недазволеных месцах, яны рызыкуюць сваім жыццём. Пачынаеш ушчуваць — у адказ чуеш нецэнзурную лаянку. А летась два тыдні аб'езды акваторыі ажыццяўляліся з АМАПам. Настаў пік, калі людзі, якія купаліся ў забароненых месцах, зрабіліся нахабнымі проста да такой ступені, што не слухалі нікога. Вось і давялося ўжыць такі моцнадзеючы сродак. Тады ўсіх парушальнікаў дастаўлялі на выратавальную станцыю, дзе адным выдаваліся папярэджанні, а «рэцыдывістам» міліцыянеры выпісвалі штрафы па артыкуле 23.63 КоАП. Санкцыя прадугледжвае грашовае пакаранне да трох базавых велічынь.

СТАР. 4

Фота Надзеі БУЖАН.

Прызначаны новы кіраўнік Мінскай вобласці

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прызначыў старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Анатоля Ісачанку, які з 2016 года займаў пасаду памочніка Прэзідэнта Беларусі — інспектара па Мінскай вобласці.

Фота БЕЛТА.

«Разбярыцеся на месцы, паглядзіце на сітуацыю яшчэ раз, ужо з гэтай вышыні, далажыце аб сваіх задумах Савету дэпутатаў, раскажыце, у якім кірунку будзем дзейнічаць, — звярнуўся да Анатоля Ісачанкі кіраўнік дзяржавы. — Вы годна да гэтага моманту пражылі сваё жыццё, і куды б вас лёс не кідаў, усё мужна ўспрымалі. Чалавек, які так пераносіць усе нягоды і перыпетыі, дастойны лепшага». Прэзідэнт пажадаў плёну ў далейшай працы новапрызначанаму кіраўніку цэнтральнага рэгіёна краіны.

Наталля Качанава, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адзначыла, што Анатоль Ісачанка добра сябе зарэкамендаваў, а адна з яго галоўных станоўчых якасцяў — уменне працаваць з людзьмі. «На мой погляд, ён правільна разбіраецца ў людзях, падборы кадраў. Тая ацэнка, якую ён даваў нам для абмеркавання, заўсёды пацвярджалася», — паведаміла яна.

Ужо сёння кандыдатура Анатоля Ісачанкі будзе прапанавана для зацвярджэння на пасадзе старшыні аблвыканкама на сесіі Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

Біяграфія Ісачанкі А. М.

Ісачанка Анатоль Міхайлавіч нарадзіўся ў вёсцы Кузнец Клінцоўскага раёна Бранскай вобласці.

У 1988 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, у 2005 годзе Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Пачынаў працоўную дзейнасць з пасады трактарыста саўгаса «Клінцоўскі». Пасля заканчэння сельгасакадэміі з 1988 па 2002 год працаваў на розных пасадах у сельскіх гаспадарках Магілёўскай вобласці. Затым працаваў на кіруючых пасадах у органах выканаўчай улады.

У 2004—2008 гадах — старшыня Кіраўскага райвыканкама. У 2008—2014 гадах — намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама; у 2014—2016 гадах — старшыня Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў.

Да назначэння ў ліпені 2017 года старшынёй Мінскага абласнога выканаўчага камітэта працаваў на пасадзе памочніка Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — інспектара па Мінскай вобласці.

Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі».

❍ У тэму

Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінскага абласнога выканаўчага камітэта:

— Мінская вобласць — асаблівая. Яна займае і па тэрыторыі, і па ўкладзе ў валавы рэгіянальны прадукт салідны працэнт. Кіраўніком дзяржавы былі пастаўлены задачы, каб як мага больш вобласць дадавала ў эканамічнай вазе, каб звярнуць увагу на тэхналагічныя пытанні і прыдаць дынаміку развіцця Мінскай вобласці ў цэлым. На сённяшні момант вобласць выконвае даведзеныя паказчыкі, а галоўны рэзерв любога рэгіёна — гэта кадры і тэхналогіі. Трэба працаваць з кадрамі. Гэта залаты запас краіны, тое, што можа рухаць нас наперад.

ПАДЧАС ГАЛОЎНАГА СВЯТА АДЗНАЧЫЛІ НАЙЛЕПШЫХ

Прэзідэнт уручыў дзяржаўныя ўзнагароды

Дзень Незалежнасці мінуў, але яго святкаванне працягваецца. Учора Аляксандр Лукашэнка ўручыў дзяржаўныя ўзнагароды найбольш вартым павагі беларусам. Урачыстасць адрознівалася не толькі асаблівa святочным настроем, але і тым, што падчас яе былі ўпершыню ў навейшай гісторыі Беларусі ўручаны медалі «За выратаванае жыццё». «Гэта новая дзяржаўная ўзнагарода, якая дазволіць адзначыць подзвігі тых суграмадзян, якія, рызыкуючы ўласным жыццём, выратавалі жыццё іншых людзей», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы.

Сярод чатырох узнагароджаных — трое ў ваеннай форме, адзін — Сяргей Драздоўскі — у грамадзянскай. Ён — старшыня Чавускага райвыканкама. Быў па справах недалёка, прыкладна за кіламетр ад месца, дзе адбыўся пажар. Разам з Аляксандрам Барсуковым, старшым участковым інспектарам міліцыі Чавускага РАУС, якога таксама ўчора ўзнагародзілі, яны пад'ехалі да агню на машыне і да прыбыцця пажарнікаў выцягнулі з палаючага дома мужчыну, які не мог рухацца. Сяргей Драздоўскі прызнаецца, што той дзень стаіць перад вачыма і зараз. «На маім месцы так дзейнічаў бы кожны добрасумленны грамадзянін. Іншы выбар было зрабіць немагчыма», — сказаў ён.

Значыць, незалежна ад наяўнасці пагонаў і колькасці зорак на іх кожны можа праявіць сябе. Хоць для кагосьці гэта — прафесійны абавязак. «Спрадвеку воін, абаронца Айчыны карыстаўся ў нашым грамадстве глыбокай павагай, лічыўся надзейнай апорай дзяржавы, — сказаў Прэзідэнт. — І сёння з намі найлепшыя прадстаўнікі Узброеных Сіл, праваахоўных органаў, падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях».

Высокія ўзнагароды атрымалі прадстаўнікі самых розных галін эканомікі і прафесій: прамыслоўцы і будаўнікі, дактары і юрысты, лесаводы і спартсмены, дзеячы навукі і культуры, сферы сацыяльнай абароны і абслугоўвання. Асобна Прэзідэнт адзначыў аграрыяў, тых, хто працуе на зямлі. «Сваёй напружанай працай, часам у вельмі неспрыяльных умовах надвор'я, яны здолелі значна павысіць экспарт харчавання, умацаваць бюджэт краіны ў нялёгкі для яе перыяд», — сказаў ён.

Шмат увагі ўдзялілі і работнікам сферы культуры. Учора званнем «Народны артыст Беларусі» быў узнагароджаны кінарэжысёр-дакументаліст Анатоль Алай, ордэнам Пашаны — прадстаўнікі Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча. «Гэта сведчыць пра тое, что чалавек працы ў нашым грамадстве мае самыя шырокія магчымасці для прымянення сваіх сіл і творчых здольнасцяў. Уклад кожнага дастойнага грамадзяніна, патрыёта сваёй краіны будзе адзначаны па заслугах», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

❍ У ТЭМУ

Іван ЦІХАН, спартсмен-інструктар нацыянальнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы:

— Хачу ўсіх павіншаваць з Днём Незалежнасці, які дастаўся нам, беларусам, досыць высокай цаной. Што датычыцца ўзнагароды, то кожная з іх мае свой час. Усцешна, што кіраўнік дзяржавы так ацаніў нашы дасягненні. На жаль, гэты спаборніцкі сезон я прапушчу, але трэніроўкі не спыняю, каб добра выглядаць на чэмпіянаце Еўропы, Еўрапейскіх гульнях, якія адбудуцца ў 2019-м у Мінску і, вядома, Алімпійскіх гульнях 2020 года ў Токіа.

Анатоль АЛАЙ, кінарэжысёр, член Беларускага саюза кінематаграфістаў:

— Мой тата, Іван Аляксеевіч, ваенны ўрач, пад Стоўбцамі трапіў у палон. Як склаўся яго далейшы лёс, мне было невядома. Але аднойчы мне тэлефанаваў супрацоўнік Камітэта дзяржаўнай бяспекі і сказаў, што адшукаў яго. «Адкрыйце сайт Саксонскіх мемарыялаў у Дрэздэне, і там значыцца ў базе даных прозвішча вашага таты». Я быў на сёмым небе ад шчасця! Сабралі творчую групу і з'ехалі ў Дрэздэн на здымкі фільма. Зараз гэтую карціну я скончыў. Яна выйдзе пад назвай «Чорны воран», дзе я расказваю пра гісторыю ўсёй сваёй сям'і.

Ігар КАТЛЯРОЎ, дырэктар Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі:

— Мы ўжо больш за дваццаць гадоў праводзім сацыялагічны маніторынг сацыяльна-палітычнай сітуацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Але два гады таму мы зразумелі, што гэтага мала, і правялі даследаванне, якое называецца «Беларусь 20—30», дзе паспрабавалі адказаць на пытанне: якой наша краіна будзе праз столькі гадоў? Цяпер работа ідзе над так званым цывілізацыйным кодам беларускай дзяржавы, дзе мы спрабуем зразумець, як традыцыі, гістарычная памяць уплываюць на будучыню.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Прэзідэнт Інтэрпала папярэдзіў аб новых пагрозах высокіх тэхналогій

Кіраўнік міжнароднай арганізацыі крымінальнай паліцыі Мэн Хунвэй прызнаў глабальныя змены ў злачыннасці і тэрарызме і папярэдзіў пра рост колькасці «новых пагроз», якія зыходзяць ад высокіх тэхналогій.

Пра гэта ён заявіў учора на адкрыцці ў Сінгапуры міжнароднай канферэнцыі Інтэрпала «Інавацыйнае садзейнічанне супрацьдзеянню пагрозам бяспекі», інфармуе ТАСС. Паводле яго слоў, зараз мы жывём у свеце глабалізацыі, назіраем вынікі тэхналагічнай рэвалюцыі і, з аднаго боку, карыстаемся ўсімі перавагамі, якія яна дае, з другога ж боку, адбываюцца глабальныя змены ў плане здзяйснення злачынстваў, у тым ліку тэрарыстычнай накіраванасці.

Прэзідэнт Інтэрпала таксама прызнаў, «што ў будучыні будзе назірацца рост пагроз, якія ўзнікаюць па меры развіцця высокіх тэхналогій, сацыяльных платформаў і іншага». У сувязі з гэтым ён заклікаў усе краіны «аб'яднаць намаганні перад тварам новых пагроз», бо «ні адна дзяржава самастойна не можа справіцца з падобным злом».

Больш за 1 млн чалавек пацярпелі з-за ліўняў і паводак на паўднёвым захадзе Кітая

У выніку зацяжных праліўных дажджоў у Гуансі-Чжуанскім аўтаномным раёне (Паўднёва-Заходні Кітай) пацярпела больш за 1 мільён чалавек, 26 чалавек загінулі і прапалі без вестак, паведаміла Міністэрства грамадзянскай абароны КНР.

Упраўленне па грамадзянскіх справах Гуансі-Чжуанскага аўтаномнага раёна паведаміла, што па звестках на 15.00 трэцяга ліпеня з-за ліўняў, якія працягваюцца з пачатку ліпеня, і навадненняў у 10 гарадскіх акругах аўтаномнага раёна, у прыватнасці ў Гуйліне, Лючжоў і Учжоў, пацярпела больш як 1 мільён 50 тысяч чалавек, маюцца таксама 16 загінулых і 10 зніклых без вестак. Акрамя таго, 92 тысячы чалавек было тэрмінова эвакуіравана, яшчэ 35 тысяч чалавек чакае выратавання. Разбурана больш за 600 і пашкоджана 6,5 тысячы жылых пабудоў. Прамы эканамічны ўрон склаў 2,88 млрд юаняў ($428 млн).

КНДР запусціла ракету ў бок Японіі

Паўночная Карэя зрабіла чарговы запуск балістычнай ракеты. Яна праляцела прыкладна 930 км і ўпала ў выключнай эканамічнай зоне Японіі, паведамляюць інфармагенцтвы.



Пуск быў ажыццёўлены раніцай у аўторак у бок Японскага мора, палёт доўжыўся каля 40 хвілін. Звестак пра ўрон пакуль няма, паведамляе агенцтва Кіёда Цусін, спасылаючыся на Аб'яднаны камітэт начальнікаў штабоў. Японія заявіла пратэст, назваўшы дзеянні КНДР парушэннем рэзалюцый Савета Бяспекі ААН. Спецыялісты мяркуюць, што ракета была запушчана па навясной траекторыі, як і «Хвансон-12», пуск якой быў праведзены ў сярэдзіне мая. Міністр абароны Японіі Тамомі Інада выказаў меркаванне, што запуск ракеты мог быць звязаны з прасоўваннем ракетнай праграмы Пхеньяна, маючым адбыцца самітам G20 (6—7 ліпеня, Гамбург) або Днём незалежнасці ЗША, які адзначаўся ўчора.

Запушчаная ў аўторак паўночнакарэйская балістычная ракета не ўяўляла небяспекі для Расіі — яна ляцела ў іншы бок. Падчас палёту ракета паднялася на вышыню 535 кіламетраў, а не на заяўленыя КНДР 2802 кіламетры, што адпавядае характарыстыкам ракеты сярэдняй далёкасці, паведамілі ў Мінабароны Расійскай Федэрацыі.

Прэзідэнт ЗША Дональд Трамп заклікаў Кітай прыняць жорсткія меры ў адносінах да КНДР пасля чарговага ракетнага запуску Пхеньяна. Пра гэта амерыканскі прэзідэнт напісаў у сваім Twitter.

«Паўночная Карэя толькі што запусціла чарговую ракету... Не магу паверыць, што Японія і Паўднёвая Карэя працягнуць з гэтым мірыцца. Можа быць, Кітай зробіць жорсткі крок у дачыненні да Паўночнай Карэі і пакончыць з гэтай недарэчнасцю раз і назаўсёды!» — напісаў Дональд Трамп.

СУПРАЦОЎНІЦТВА Ў ІМЯ МІРУ

Сёння ў сталіцы Беларусі адкрываецца 26-я летняя сесія Парламенцкай асамблеі АБСЕ (ПА АБСЕ). Яе тэма: «Умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне АБСЕ». Чакаецца, што ў сесіі прымуць удзел 700 гасцей, у тым ліку 300 парламентарыяў з Паўночнай Амерыкі, Еўропы і Азіі. Штогадовая сесія завершыцца 9 ліпеня прыняццем Мінскай дэкларацыі. Дакумент будзе ўтрымліваць рэкамендацыі для міжнароднай супольнасці па пытаннях палітыкі, бяспекі, эканомікі, навакольнага асяроддзя і правоў чалавека.

Як напярэдадні адзначыў **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА**, наша краіна ўпершыню прымае ў сябе такі значны форум. На яго думку, работа, якая была праведзена ў цесным кантакце з Міжнародным сакратарыятам ПА АБСЕ, дазваляе спадзявацца, што Беларусь пацвердзіць сваю рэпутацыю надзейнай дыялогавай пляцоўкі для абмеркавання самых адчувальных пытанняў міжнароднага парадку. «Мы вельмі зацікаўлены ў тым, каб мерапрыемства прайшло ў канструктыўным ключы і насіла аб'яднаўчы, а не раз'ядноўваючы характар», — заявіў Уладзімір Андрэйчанка.

У Мінскую дэкларацыю ўвойдуць некалькі дадатковых рэзалюцый, якія ініцыююць асобныя парламентарыі самастойна. Яны закранаюць шырокае кола пытанняў: процідзеянне тэрарызму, міграцыйныя выклікі, недапушчальнасць распальвання міжрэлігійнай варожасці і ўмацаванне энергетычнай бяспекі. Тэма беларускай рэзалюцыі — «Распрацоўка своечасовых і эфектыўных заканадаўчых, нарматыўных, адміністрацыйных мер рэагавання на з'яўленне новых псіхаактыўных рэчываў». Як паведаміў Уладзімір Андрэйчанка, яе праект ужо атрымаў міжнародную падтрымку: 44 парламентарыі з 20 замежных краін выступілі суаўтарамі гэтай рэзалюцыі, сярод іх — 11 кіраўнікоў дэлегацый, у прыватнасці з Германіі, Расіі, Чэхіі, Румыніі і Сербіі.

Асноўная задача Парламенцкай асамблеі — садзейнічанне міжпарламенцкаму дыялогу па вырашэнні праблем у галіне дэмакратыі ва ўсіх 57 дзяржавах-удзельніцах, якія знаходзяцца як у Еўразіі, так і ў Паўночнай Амерыцы. Падчас 26-й сесіі работа Асамблеі будзе арганізавана ў рамках трох агульных камітэтаў: камітэта па дэмакратыі, правах чалавека і гуманітарных пытаннях; камітэта па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі; камітэта па палітычных пытаннях і бяспецы.

Ілья КРЫЖЭВІЧ. *Kryzhevich@zviazda.by*

■ Нашы дзеці

Дзевяць дзён без бацькоў, або Урокі самастойнасці

Майстар-клас па баскетболе, гатаванне канапэ і тэст на прафесію. Гэтымі і іншымі справамі на выхадных займаліся выхаванцы палатачнага ваенна-патрыятычнага лагера «Абаронцы Айчыны» на базе Мінскага гарадскога адукацыйна-аздараўленчага цэнтра «Лідар», што непадалёк ад Ждановічаў. Да падлеткаў завіталі трэнер Аляксандр Куль з сям'ёй, прадстаўнік МНС Віталь Дэмбоўскі, супрацоўнікі сталічнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей і сябры «Клуба львоў».

Арганізатары прафілактычнай акцыі «Сям'я — тэрыторыя здароўя» зладзілі свята ў «Лідары», каб расказаць падлеткам і моладзі пра здаровы лад жыцця.

— *Мы вырашылі зладзіць майстар-класы з вядомымі спартсменамі і кулінарамі,* — расказаў **Вячаслаў ШЧЭРБА, старшыня праўлення РДГА «Клуб ільвоў».** — *Як вядома, бацькі найчасцей песцяць сваіх малых і многія хатнія абавязкі выконваюць за іх. А тут яны змогуць нешта зрабіць самастойна.*

26 падлеткаў, якія адпачываюць у лагеры, — незвычайная змена. Усе яны — найлепшыя вучні, што летась неслі пачэсную вахту памяці каля Вечнага агню на плошчы Перамогі. Дзевяць дзён змены яны загартоўваліся, набывалі навыкі самастойнасці і адказнасці за свае паводзіны, жывучы ў палатках.

— *У нашым лагеры існуе камандны склад з кіраўніком змены і начальнікамі каравула. Падлеткі адпрацоўваюць лідарскія якасці, загартоўваюць характар і вучацца дысцыпліне,* — расказаў **начальнік лагера, культарганізатар Палаца дзяцей і моладзі Генадзь ХЛУТКОЎ.** — *Адпрацоўвалі страявую падрыхтоўку, гулялі ў ваенна-спартыўныя гульні «Зарніца» і «Арлёнак», якія імітуюць баявыя дзеянні, выязджалі ў Хатынь і наведвалі роту ганаровага каравула. А на свята Дня Незалежнасці ўсклалі кветкі да Вечнага агню і неслі ганаровую вахту.*

Прадстаўніца цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей на прафарыентаваным майстар-класе давала падлеткам тэсты, каб выявіць іх здольнасці да будучай прафесіі. Яна заўважыла, што пры жаданні хлопцы могуць летам і падпрацаваць. Прадпрыемства «Мінскзеленбуд» і тэрытарыяльны цэнтр пазашкольнай працы ахвотна прымаюць на сезонныя работы падлеткаў да 16 гадоў.

Шар, куб, піраміду і іншыя выявы хлопцы і дзяўчаты лянпілі з кенетычнага пяску на майстар-класе па займальнай псіхалогіі, спрабуючы праз атрыманае зразумець сваё стаўленне да свету.

Паказаць свае спартыўныя здольнасці яны змаглі на баскетбольнай пляцоўцы, дзе пад кіраўніцтвам **Аляксандра КУЛЯ, экс-цэнтравога баскетбольнай каманды «Цмокі-Мінск»,** асвойвалі тэхніку гульні і трохачковыя кідкі.

— *Работа з дзецьмі для мяне задавальненне,* — *кажа Аляксандр.* — *Калі ёсць магчымасць падзяліцца вопытам, паказаць ім, што не трэба ўвесь вольны час праводзіць за рознымі мабільнымі прыладамі,* — *гэта цудоўна. Да таго ж мы выехалі за горад усёй сям'ёй, думаю, усе атрымалі станоўчыя эмоцыі.*

На кулінарным майстар-класе ад шэф-кухароў «Клуба львоў» падлеткі змаглі не толькі навучыцца рабіць «хуткія стравы», але і тут жа падсілкавацца імі. Кавалачкі хлеба, агуркоў, каўбасы, сыру, лімонаў і іншых прысмакаў фарміраваліся ў стройнае канапэ строга па рэцэпту.

Тры гадзіны мерапрыемства праляцелі незаўважна. Самі падлеткі пра дзень, з якога кожны вынес для сябе нешта важнае, казалі з энтузіязмам:

— Усё вельмі спадабалася! А магчымасць пажыць асобна, без апекі бацькоў, і павучыцца самастойнасці — цудоўны вопыт!

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

■ Надвор'е

Дажджы і прахалода

У наступныя дні ў Беларусі захаваецца дажджлівае і халоднае надвор'е, паведамляюць у Рэспубліканскім цэнтры па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды. Гэта будзе абумоўлена змяшчэннем франтальных раздзелаў, што рухаюцца ў бок нашай краіны з Балтыйскага мора. Але максімальная колькасць ападкаў прыпадзе на першую палову тыдня.

Сёння, у сераду, на пераважнай частцы краіны прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, днём мажлівыя навальніцы. Удзень у асобных раёнах чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 метраў за секунду. Уначы тэмпература складзе 6—12 градусаў цяпла, днём паветра прагрэецца да 14—21.

Заўтра, у чацвер, з ростам атмасфернага ціску аб'ёмы ападкаў зменшацца. Кароткачасовыя дажджы пройдуць толькі ў асобных раёнах краіны, але днём верагоднасць навальніц захаваецца. Уначы будзе 5—11 градусаў цяпла, удзень — 13—20.

Халодна будзе і бліжэй да канца тыдня. Так, ноччу ў пятніцу папярэдне прагназуецца 4—11 градусаў вышэй за нуль, днём — 14—21. У суботу ўначы 6—13 градусаў цяпла, удзень — 16—23. А ўжо ў нядзелю паступова пачне цяплець: 7—14 градусаў ноччу, 18—24 — днём, а на паўднёвым захадзе паветра можа прагрэцца і да 27. Але хаваць парасоны далёка не рэкамендуецца — у асобных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Падрабязнасці

Страхавы стаж для некаторых грамадзян будзе зменшаны

29 чэрвеня 2017 года Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь падпісаны Указ №233 «Аб пенсійным забеспячэнні асобных катэгорый грамадзян», які ўступае ў сілу з 1 жніўня гэтага года. Міністэрства працы і сацыяльнай абароны пракаментавала змены, якія ўносяцца гэтым дакументам.

Мэта ўказа — павысіць узровень пенсійнага забеспячэння грамадзян, якія доўгі час ажыццяўлялі сацыяльна значныя віды дзейнасці, і з гэтай прычыны не змаглі сфарміраваць страхавы стаж, неабходны для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце.

Як адзначаюць спецыялісты Мінпрацы і сацабароны, у гэтым годзе неабходны страхавы стаж складае 16 гадоў і будзе і далей паступова павышацца (штогод на 6 месяцаў, да 2025 года) — да дасягнення 20 гадоў.

Указ прадугледжвае магчымасць прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце пасля дасягнення агульнаўстаноўленага пенсійнага ўзросту пры страхавым стажы не менш за 10 гадоў грамадзянам, якія маюць стаж працы не менш за 40 гадоў у мужчын і 35 гадоў у жанчын.

Таксама пры працягласці страхавога стажу не менш за 10 гадоў будзе прызначацца пенсія па ўзросце грамадзянам, якія доўгі час (не менш за 10 каляндарных гадоў) праходзілі ваенную службу (службу ў ваенізаваных арганізацыях), але не набылі правы на пенсію ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб пенсійным забеспячэнні ваеннаслужачых, асоб начальніцкага і радавога складу органаў унутраных спраў, Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз Рэспублікі Беларусь, органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях і органаў фінансавых расследаванняў». Права на працоўную пенсію па ўзросце ім будзе давацца пры наяўнасці стажу працы не менш за 25 гадоў у мужчын і 20 гадоў у жанчын.

Указ таксама дае магчымасць уключэння ў стаж працы для прызначэння працоўнай пенсіі перыядаў догляду за інвалідам 1-й групы або дзіцяці-інваліда ва ўзросце да 18 гадоў, а таксама за састарэлымі, якія дасягнулі 80-гадовага ўзросту і якія маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе, да дасягнення грамадзянамі, якія ажыццяўлялі догляд, узросту 65 гадоў (для мужчын) і 60 гадоў (для жанчын).

Падрабязнасці можна даведацца на сайце Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

■ Здарэнні

ЦЯГНІК ПРАТАРАНІЎ АЎТО

Трагедыя адбылася ў Слоніме, паведамляюць у прэс-службе Міністэрства па надзвычайных сітуацыях.
Апоўдні да ратавальнікаў паступіла паведамленне аб тым, што на адным з чыгуначных пераездаў адбылося дарожна-транспартнае здарэнне з удзелам грузавога саставу і легкавога аўтамабіля.
У машыне засталіся заблакаванымі людзі.

На месца прыбылі падраздзяленні МНС, якія высветлілі, што пад цягнік трапіў аўтамабіль «Волга» пад кіраваннем мужчыны 1954 года нараджэння. Падчас следавання цераз пераезд пенсіянер не прапусціў таварны састаў. Ратавальнікі дасталі з аўтамабіля дзвюх пасажырак, а таксама цела загінулага кіроўцы. Адна з жанчын пазней памерла ў бальніцы. Абставіны здарэння ўдакладняюцца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Братэрства

Перакладчыцкі інстытут Камрана Назірлі

У Азербайджане прыкладаецца шмат намаганняў для знаёмства з беларускай літаратурай.

У Беларусі і Азербайджана шмат агульнага ў памкненнях да фарміравання прасторы цікаўнасці нацыянальнага чытача да літаратур розных краін. У Мінску выходзяць кнігі азербайджанскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову. У Баку — наадварот: проза і паэзія беларускіх пісьменнікаў гучыць па-азербайджанску.

Асаблівую руплівасць праяўляе празаік, драматург і перакладчык Камран Назірлі. Ён пераклаў на сваю родную мову кнігу лаўрэата Нобелеўскай прэміі Святланы Алексіевіч «У вайны не жаночы твар», аповесць Анатоля Матвіенкі «Галоўная таямніца КДБ», а таксама — апавяданні Алеся Бадака, Георгія Марчука, якія надрукаваны ў перыядычных выданнях Азербайджана. Зараз з удзелам Камрана Назірлі бакінскае выдавецтва «Мутарджым» распачынае праект па выданні серыі кніг «Сучасная беларуская літаратура». Першымі пабачаць свет зборнікі апавяданняў Алеся Бадака, Георгія Марчука, раман Мікалая Чаргінца «Сыны».

І беларускі бок не застаецца ў даўгу. Апошнім часам пабачылі свет на беларускай мове кнігі паэзіі Чынгіза Алі аглу, Лейлы Аліевай, зборнік казак і вершаў для дзяцей «Базгулаг і поры года» Севіндж Нурукызы.

Стварэнню такога шырокага прасцягу для прапаганды беларускай літаратуры ў свеце сёння спрыяе менавіта творчая ініцыятыва такіх людзей, як Камран Назірлі. У Таджыкістане сучасную беларускую прозу і паэзію прапагандуе выдавец і літаратар Ато Хамдам. У Казахстане — літаратуразнаўца Святлана Ананьева. У Малдове — публіцыст Юрый Іваноў. Ва Украіне — паэт, перакладчык, дзіцячы пісьменнік Аляксей Кананенка. У Туркменістане — празаік і паэт Агагельды Аланазараў, малады літаратар Максат Бяшымаў. Руплівасць гэтых сяброў часам роўная праца іншых інстытутаў.

Мікола БЕРЛЕЖ

БПС-СБЕРБАНК

Уважаемые клиенты!

С 05.07.2017 ОАО «БПС-Сбербанк» устанавливает следующий размер процентов по действующим договорам в белорусских рублях срочного банковского депозита «Доверяй +», заключенным до 01.04.2016:

Размер процентов (годовых)
3,5

Установленный размер процентов будет применен к депозиту с 05.08.2017.

Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 28.11.2014 года на осуществление банковской деятельности. УНП 100219673
ОАО «БПС-Сбербанк»

ТАКІХ МУЗЕЯЎ НАМ НЕ ХАПАЕ

Яблыня для Максіма

У пачатку 1990-х у Малой Багацькаўцы на месцы былой хаты Гарэцкіх, якая згарэла, была адбудавана новая — пад музей. Летась узнікла пытанне аб пераносе музея ў Мсціслаў. Нагадаем, ідэю гэту прапанавала адна з мінчанак, якая палічыла, што да вясковага музея складаней дабірацца, чым да гарадскога. Бо ад Мсціслава да малой радзімы Гарэцкага прыкладна 26 кіламетраў. Каб разабрацца ў праблеме, «Звязда» ў снежні мінулага года звярталася да гэтай тэмы. Музей пакінулі там, дзе ён і быў. Як растлумачылі ў аддзеле ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мсціслаўскага райвыканкама, аўдыторыя падзялілася на дзве часткі. Адны выказваліся за перанос, другія супраць. Прычым спрачаліся ў асноўным мінчане. Пераканаўчым стаў аргумент, што каштоўнасць музея ў Малой Багацькаўцы, акрамя таго, што там пануе тая аўра, у якой рос будучы беларускі класік, яшчэ і ў тым, што там пахаваны яго бацькі і сваякі.

Выбар зроблены, але пытанні засталіся. Музей наведваюць ў асноўным школьнікі Мсціслаўскага раёна, якіх спецыяльна прывозяць на аўтобусе. Іншых экскурсій наогул няма. Зрэдку заязджаюць аматары, якім цікава асоба Максіма Гарэцкага. Па словах **дырэктара Мсціслаўскага раённага гісторыка-археалагічнага музея Людмілы КІРЫЕНКІ**, за паўгода там пабывалі толькі бацька з сынам са Слуцка. Дарэчы, яны прывезлі з сабой саджанец яблыні і з дазволу абслуговага персаналу музея пасадзілі непадалёк ад хаты пісьменніка.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дацэнт кафедры тэорыі літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Міхась Кенька падкрэсліў важнасць ушанавання памяці.

«Мсціслаўскі вулкан талентаў не заглух...»

...пісаў Уладзімір Караткевіч у кнізе «Мсціслаў. Эсэ пра гісторыю і людзей адной зямлі», маючы на ўвазе Максіма Гарэцкага. Вось некалькі цытат з яго твора. *«Для мсціслаўцаў Максім Гарэцкі дарагі яшчэ і за тое, што ў творах ягоных гамоніць, радуецца, працуе, плача і смяецца, гаворыць адметнай і трапнай гаворкай уся Мсціслаўшчына...»*

Пісьменнік таксама згадвае не менш таленавітага брата Максіма Гарэцкага — Гаўрылу, «аднаго з выдатных геолагаў Саюза, акадэміка, заснавальніка нашай палеапатамалогіі, навукі аб рэках даўно мінулых часоў». Уладзімір Караткевіч хацеў, каб у Малой Багацькаўцы стварылі сядзібу братоў Гарэцкіх і ўключылі яе ў турыстычны маршрут «Залатое кальцо Магілёўшчыны».

Музей паявіўся, але такога маршруту пакуль няма. А без гэтага музей дрэнна працуе. Пра яго ведаюць у асноўным толькі жыхары раёна. А пра тое, што ў Горках быў дом, дзе жыў Максім Гарэцкі, большасць даведалася толькі пасля таго, як яго знеслі. І тое, дзякуючы, гнеўным публікацыям у СМІ. Летась, пасля таго як у «Звяздзе» быў надрукаваны артыкул пра магчымы пераезд музея з Малой Багацькаўкі, пляменнік пісьменніка Радзім Гарэцкі вельмі балюча ўспрыняў навіну. Ён накіраваў у рэдакцыю падрабязную справаздачу, як ствараўся музей і ўшаноўвалася памяць пісьменніка. Ён з крыўдай успамінаў пра знесены дом у Горках і памятны знак, які абяцалі зрабіць, але так і не ўсталявалі.

Што трэба для памяці?

Гісторыкі, літаратуразнаўцы, музейныя супрацоўнікі сабраліся ў музеі гісторыі Магілёва за круглым сталом, каб абмеркаваць пытанні музеефікацыі літаратурных мясцін. Удзел у размове прынялі супрацоўнікі Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, прадстаўнікі грамадскага аб'яднання «Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх», Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, Беларускага фонду культуры, прадстаўнікі мясцовай улады, абласнога краязнаўчага музея імя Раманава, Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Перад пасяджэннем яны наведалі музей Максіма Гарэцкага ў Малой Багацькаўцы і засталіся вельмі задаволены, што музей пакінулі на месцы. Бо, на думку спецыялістаў, было б цяжка потым тлумачыць турыстам пра тое асяроддзе, у якім выхоўваўся будучы пісьменнік. Адзінае, што трэба змяніць, гэта адносіны да музея.

— Трэба болей рэкламаваць гэта месца, рабіць усё, каб пра яго ведалі ў вобласці, краіне, — лічыць **дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Дзмітрый ЯЦКЕВІЧ**. — Квэсты, педагагічныя заняткі, лекцыі, фэсты — трэба шукаць розныя формы. А яшчэ распрацоўваць турыстычныя маршруты, каб забяспечыць прыток людзей.

Вядомая рэч, што аднымі сіламі Мсціслаўскага гісторыка-археалагічнага музея, на балансе якога знаходзіцца дом у Малой Багацькаўцы, турыстаў не прывабіш. У гэтым павінны быць зацікаўлены і мясцовыя ўлады, прычым зноў-такі не толькі Мсціслава. Вёска знаходзіцца якраз на паўдарозе паміж Мсціславам і Горкамі. Трэба, каб і другі бок прыклаў намаганні.

Музеяў шмат не бывае

Ёсць прыклады ў краіне, калі музеі працуюць у асноўным толькі на адных імёнах. Той жа адноўлены музей Рэпіна ў Здраўнёве на Віцебшчыне, Васіля Быкава ў Бычках і нават палац Радзівілаў у Нясвіжы.

— У нас не хапае музеяў, прысвечаных таму ці іншаму знакамітаму беларускаму роду, на прыкладах якіх можна было б выхоўваць людзей, — адзначыў **старшыня грамадскай арганізацыі «Беларускі фонд культуры» Уладзімір ГІЛЕП.** — У маштабах вёскі, раёна абавязкова павінен быць музей якога-небудзь роду, годнага ўшанавання. У сучаснай моладзі адсутнічае пачуццё гонару за сям'ю, род.

Дарэчы, Магілёўшчына вельмі багатая на знакамітыя прозвішчы: Аркадзь Куляшоў, Алесь Адамовіч, Аляксей Пысін, Алесь Пісьмянкоў... І для іх папулярызацыі недастаткова куточкаў у школе або стэнда ў краязнаўчым музеі.

Вандроўка па мясцінах Гарэцкага

Наступны год юбілейны для Максіма Гарэцкага, спаўняецца 125 гадоў са дня яго нараджэння. І, каб гэта імя гучала як мага мацней, удзельнікі круглага стала прапанавалі наступны год назваць Годам Максіма Гарэцкага. Размова таксама ішла пра тое, што ў найбліжэйшы час трэба пачаць падрыхтоўку матэрыялаў для выдання творчай спадчыны Максіма Гарэцкага ў выглядзе збору твораў, а таксама аднатомнага энцыклапедычнага даведніка «Максім Гарэцкі».

Па ацэнцы спецыялістаў, стан дома ў Малой Багацькаўцы добры. Трэба толькі правесці добраўпарадкаванне тэрыторый і мясцін, звязаных з жыццём і творчасцю пісьменніка. Неабходна таксама арганізаваць вандроўкі па мясцінах, звязаных з імем Максіма Гарэцкага, з абавязковым наведваннем Літаратурнага музея ў Малой Багацькаўцы. А ва ўстановах культуры і адукацыі арганізаваць мерапрыемствы, прысвечаныя юбілейнай даце. У планах таксама правесці ўрачыстыя мерапрыемствы з удзелам дыпламатычных прадстаўніцтваў РБ і беларускіх суполак у краінах, дзе пражываў Максім Гарэцкі — Расіі, Літве, Латвіі, Польшчы і іншых.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

«ДЗЕ ХАЧУ, ТАМ І ПЛАВАЮ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Ратавальнікам на вадзе шмат галаўнога болю дастаўляюць п'яныя кампаніі, — кажа Дзяніс Чашун. — На процілеглым баку Камсамольскага возера з боку праспекта Пераможцаў адкрылася шмат бараў. Хітрая кампанія разбіваецца на дзве часткі. Першая ідзе да нас, каб узяць напракат катамаран. Паколькі людзі цвярозыя, алкаголю пры сабе не маюць, то мы ім катамаран выдаём. А пасля яны падбіраюць таварыша з «гаручым» дзе-небудзь у зацішным месцы. І аднойчы мы такую п'яную кампанію засеклі на катамаране падчас абходу акваторыі. Яны знялі выратавальныя камізэлькі і піравалі. Убачылі, што мы выязджаем з-за павароту, і далі драла. Адзін адпачывальнік падае за борт. Мы — да небаракі, а катамаран — хутчэй ад нас. Чалавека дасталі, прывезлі на выратавальную станцыю. У крыві было тры праміле алкаголю. А сябры прыехалі толькі праз тры гадзіны. І спыталі адразу ж: «А дзе наш таварыш?» Я ў адказ: «А чаму вы ўцякалі?» — «Мы спалохаліся». Я кажу: «А вы разумееце, што ён мог патануць і яму маглі б не дапамагчы?» «Разумеем, але спалохаліся». Так што не ўсе тыя сябры, хто называе сябе так...

У летні перыяд у чалавека, які тоне, ёсць у запасе толькі пяць хвілін. Пасля гэтага наступае кіслароднае галаданне і мозг памірае. І нават калі небараку ўдасца выратаваць ад смерці, то дэ-факта гэта будзе жывы труп.

— Паспець уратаваць чалавека не так і лёгка. Стандартная сітуацыя: прыязджаем на выклік. Пытаемся: дзе патануў ваш таварыш? Адзін паўп'яны паказвае ў адзін бок, другі — у процілеглы. Бачнасць у мутнай вадзе складае 5—20 сантыметраў. Каб уявіць сабе працу вадалаза, зайдзіце ў падвал, выключыце святло і паспрабуйце навобмацак выцягнуць прадмет, які знаходзіцца невядома дзе. Лёгка?

У сярэднім за дзень водныя ратавальнікі выязджаюць на баявы выклік 2—3 разы. Праўда, сярод іх шмат ілжывых. Большасць з іх разгортваецца па адным і тым жа сцэнарыі. Сядзела на беразе кампанія, адпачывала са спіртным. Адзін чалавек вырашае сысці ў цень і прылегчы адпачыць. Там ён засынае. Рэчы застаюцца на месцы. Кампанія бачыць: вопратка ёсць, чалавека няма. Значыць, патануў. Набіраюць нумар 101. Мы прыязджаем, пачынаем шукаць тапельца. Праз дзве гадзіны выходзіць паўп'яны чалавек з кустоў і пытаецца: «А каго тут шукаюць?» — «Дык цябе і шукаюць!» — «А я тут заснуў... метраў за пяцьсот...»

— А часам нам паведамляюць падлеткі, што тоне іх таварыш, — расказвае Дзяніс Чашун. — Прылятаем, бачым: стаяць па калена ў вадзе, крычаць, што тонуць, і самі рагочуць. А дзесьці ў гэты час можа адбывацца сапраўдная бяда.

Асноўная маса тых, каго ратуем, — адны і тыя ж людзі. Летась мы даставілі на выратавальную станцыю навучэнца аднаго са сталічных каледжаў шэсць разоў. А бывае і так, што выцягнулі п'янага, аддалі таварышам і кажам, каб не пускалі яго ў воду. Ад'язджаем, абарочваемся — а ён зноў ляціць у Свіслач.

Таксама ўскладняюць дзяжурства адпачывальнікі на матрацах. На кожнай такой прыладзе напісана, што яна не з'яўляецца плавальным сродкам. Парушальнікі ж пачынаюць прыдумляць самыя неверагодныя версіі. Маўляў, заляжаўся, не заўважыў, як за буй занесла. Ці знесла хваляй з берага. Асабліва весела гэта чуць у бязветраны дзень. Калі я працаваў на Мінскім моры, то аднойчы сутыкнуўся з выпадкам, як два чалавекі на матрацы спрабавалі праплыць... сем з паловай кіламетраў. Больш за тое, матрац быў гружаны сумкамі са спіртным. Аказалася, што на выспе адпачывала кампанія, а іх забылі...

«У летні перыяд у чалавека, які тоне, ёсць у запасе толькі пяць хвілін. Пасля гэтага наступае кіслароднае галаданне і мозг памірае. І нават калі небараку ўдасца выратаваць ад смерці, то дэ-факта гэта будзе жывы труп».

У забароненых месцах пры купанні можа падсцерагаць і схаваная небяспека. Вадалазы знаходзілі на дне возера ванны, кухонныя пліты, смеццевыя кантэйнеры і нават светлавыя мачты. Запчасткі ад аўтамабіляў і бляшанкі з-пад кансерваў — гэта ўжо стандартны набор. І вось у месцы, дзе купанне не дазволена, з'яўляецца адпачывальнік, умоўны Вася. Ён лезе на бетонны пірс і скача ў ваду. У выніку ратавальнікі дастаюць гэтага Васю з ужо зламаным хрыбетнікам. А ўсё з-за таго, што мінулай ноччу ўмоўны Пеця вырашыў парысавацца перад дзяўчынай і скінуў у ваду бетонную сметніцу.

«Тут вада цяплейшая!» — «А там — бясплатная!»

Акваторыя Камсамольскага возера спецыфічная. Бераг Свіслачы ў гэтым месцы даволі крывы, ды і велізарны востраў замінае паўнавартаснаму агляду непасрэдна са станцыі. І менавіта таму для школьнікаў, якія ўтульна размясціліся каля самых соплаў непрацуючага фантана, наша з'яўленне стала зусім нечаканым.

Фота Надзеі БУЖАН.

— Гм, калі гэты фантан уключыцца раптам, то ім жа галовы адсячэ напорам вады, — прамармытаў адзін з матросаў.

— Гэй, вы што тут робіце? А дзе дарослыя?

— Ды мы тут з Дома грэблі, практыкуемся.

— Без суправаджэння?

— А нам дазволілі.

— Хто менавіта дазволіў? Зараз спытаем у трэнера.

Дарога да трэнера доўгая, займае некалькі кіламетраў. І яна пралягае праз месцы, якія вельмі палюбіліся нядобрасумленным купальшчыкам. Першага з іх мы засякаем літаральна праз паўхвіліны. Мужчына гадоў 50 купаўся даволі далёка ад буйкоў.

— Так, што вы тут робіце? Кіруйцеся на пляж.

— А тут вада цяплейшая, — спрабуе жартаваць парушальнік.

— Затое там — бясплатная. Колькі складае штраф, ведаеце?

Купальшчык нешта прабурчаў і павярнуў да буйкоў.

Заўважыўшы лодку ратавальнікаў, з пірса на процілеглым баку вокамгненна з вопраткай у руках збягаюць двое падлеткаў, з якіх вада льецца цурком. А мы праязджаем мост цераз вельмі ажыўленую вуліцу Арлоўскую.

— З яго вельмі любяць скакаць экстрэмалы. Роўна па цэнтры тут глыбіня — два з паловай метры. А крыху ўлева ці ўправа — метр сорак. І калі неабачлівы плывец патрапіць на гэта месца — ён амаль стапрацэнтны інвалід... Тут Дзяніс Чашун рэзка паварочвае лодку ўправа. А там — карціна, як кажуць, алеем. Дзве жанчыны загараюць на беразе ракі. Дзіця адной з іх ходзіць па парапеце. Маці гэта не бачыць, бо яна ляжыць галавой у процілеглы бок.

— Гэй, маці, забярыце сына з парапета! — крычаць з лодкі.

— А што тут можа здарыцца? — перапытвае жанчына.

— Ды тут вельмі глыбока, доўга даставаць будзем, калі зваліцца.

— Калі чалавек тоне, ён зусім не крычыць, — кажа **ратавальнік-вадалаз Мікалай КАСЦЮКЕВІЧ.** — Вада запаўняе лёгкія імгненна. Таму не верце ў гэтай частцы кінафільмам...

Жанчына тут жа кліча малога да сябе. А мы неўзабаве пад'язджаем да Дома грэблі. Пасля непрацяглай размовы з супрацоўнікамі Таварыства ратавання на водах трэнер дастае мабільны тэлефон і прыкладвае яго да вуха. На зваротнай дарозе мы спецыяльна заязджаем да непрацуючага фантана, дзе і злавілі першых парушальнікаў. Адметна — там ужо нікога няма...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

Мясцовае самакіраванне
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
5 ліпеня 2017 г. №24 (408)

5 стар.

Падумалі і стварылі... асацыяцыю Саветаў

6 стар.

У полі зроку — праблемныя сем'і

8 стар.

Па цэнтральнай вуліцы з аркестрам

ТЭМА ТЫДНЯ

РОБАТЫ, СПАДАРОЖНІКІ І ПАЛЬЧАТКА-ТРЭНАЖОР

Якімі інавацыямі здзівілі беларусы наведвальнікаў выстаўкі падчас IV Форуму рэгіёнаў



Фота БЕЛТА.

Беларускія дзяўчаты з БРСМ у вышыванках.

На ўваходзе на выстаўку Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі сустракае робат, што паважліва спыняецца насупраць і пачынае вітацца: «Я рада быць тут і бачыць вас...» Нездарма сёлетнюю выстаўку назвалі «інавацыйнай». Сапраўды, на ёй можна даведацца пра ўнікальныя тэхналагічныя дасягненні нашых краін.

Першае — і самае вялікае, што прыцягвае ўвагу, гэта беларускі электробус. Падчас наведвання выстаўкі спікеры верхніх палат беларускага і расійскага парламента толькі што не праехалі на ім: ацанілі, наколькі зручна ўнутры, прайшліся па салоне, уважліва разгледзелі. Дарэчы, ужо ідуць перагаворы аб тым, каб пастаўляць такі від транспарту ў расійскую сталіцу.

3 стар.

НА ВЫЕЗД!

Добрая звычка

На «Ціхмянаўскай вышыні».

Наш карэспандэнт прыняў удзел у выязной сесіі Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў. У цэнтры ўвагі была тэма добраўпарадкавання.

ВЁСКА МАЕ... ГЕРБ

Аўтару гэтых радкоў прапанавалі экскурсію па тэрыторыі Бабінавіцкага сельсавета. Прыгожа і ўтульна ў аграгарадку Бабінавічы. Тутэйшыя жыхары ганарацца яго па-свойму ўнікальнай гісторыяй. Да Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года Бабінавічы былі горадам з насельніцтвам каля 1160 чалавек і мелі свой герб. Такім чынам, вопыт самакіравання тут вялікі.

— Першапачаткова герб быў зацверджаны Кацярынай II — у 1781 годзе. На ім — дзве мачты з флюгерамі. Мачты — бо шмат вякоў продкі заробленае на продажы лесу, з якога рабілі і караблі. Яго па Заходняй Дзвіне сплаўлялі аж у Рыгу. А ў 2014-м Прэзідэнт падпісаў Указ, дзякуючы якому ў населенага пункта зноў з'явіўся герб. На сёння ў Бабінавічах усяго каля 400 жыхароў, — расказвае **старшыня Бабінавіцкага сельскага Савета дэпутатаў Вольга МАРЖАЕДАВА.**

Пра мінулае шмат расказалі ў народным музеі баявой славы, які пакуль што знаходзіцца ў яслях-садку-базавай школе. Летась навучальнай установе споўнілася 210 гадоў: у 1806-м у Бабінавічах адкрылі двухкласнае прыходскае вучылішча. З-за таго што ў школе параўнальна мала дзятвы, яе зачыняюць. У новым вучэбным годзе дзяцей будуць вазіць на вучобу ў суседні аграгарадок... Але застанецца цудоўны сад, вінаграднік, у цэлым добраўпарадкаваная тэрыторыя.

УНІКАЛЬНАЕ ГАНЧАРСТВА

Музейную экспазіцыю плануюць размясціць у будынку прадстаўнічага органа ўлады. Бадай, гэта будзе першы такі вопыт у вобласці.

— А музей наш багаты на экспанаты. У прыватнасці, расказваем пра знакамітую бабінавіцкую школу ганчароў. Да сярэдзіны 1950-х тут працавала арцель: каля 40 майстроў! Пра традыцыйнае рамяство нават у Вялікай савецкай энцыклапедыі напісалі. Наша ганчарства мае сваю непаўторную асаблівасць, — расказвае **дырэктар школы Таццяна ВАРАНЦОВА.**

5 стар.

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

КОЖНЫ АДШУКАЎ ТАВАР ПА САБЕ

Спікеры верхніх палат аглядзелі кірмаш

Падчас IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі адбыўся кірмаш-продаж беларускіх тавараў. Яго наведалі старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч і старшыня Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Мацвіенка.

На наступны дзень пасля наведвання Валянціна Мацвіенка прызналася журналістам, што не ўтрымалася і набыла сабе на кірмашы дзве пары абутку беларускага брэнда «Марка», якія ў той жа вечар прымерала і ўпадабала. Яна таксама расказала, што на кірмашы людзі падыходзілі і прасілі, каб падобнага кшталту продажы былі арганізаваны часцей. Па словах Міхаіла Мясніковіча, кірмашы не прыносяць вялікага прыбытку для вытворчасцяў і маюць больш выдаткаў, чым даюць прыбытку, але яны маюць іміджавае сацыяльнае значэнне.

Увазе наведвальнікаў быў прапанаваны асартымент тавараў лёгкай прамысловасці і прадуктаў харчавання, якія прадставілі больш за 60 вядучых беларускіх прадпрыемстваў-вытворцаў з усіх рэгіёнаў нашай краіны. На кірмашы можна было паўдзельнічаць у культурна-забаўляльнай праграме, пабачыць выступленне беларускіх ансамбляў, прадэгуставаць мяса-малочную прадукцыю, кандытарскія і хлебабулачныя вырабы. Падчас кірмашу таксама адбыўся шэраг бізнес-сустрэч і дзелавых перагавораў кіраўнікоў прадпрыемстваў і рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

АД ВЫСОКІХ ТЭХНАЛОГІЙ ДА ЗАКАНАДАЎСТВА

Падчас Форуму рэгіёнаў сенатары паўдзельнічалі ў рабоце секцый

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі выступілі мадэратарамі тэматычных секцый.

Напрыклад, Ірына Старавойтава, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, мадэрыравала работу секцыі, прысвечанай навукова-тэхнічнаму супрацоўніцтву ў сферы інавацыйнай дзейнасці і высокіх тэхналогій паміж Беларуссю і Расіяй. А Ала Бодак, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, арганізоўвала работу секцыі, прысвечанай гарманізацыі заканадаўства паміж нашымі краінамі.

НЕ ПАКІНУЛІ БЕЗ УВАГІ

Члены Савета Рэспублікі ўзялі ўдзел у сесіі Савета дэпутатаў і пасяджэнні выканкама

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Алена Краткова, галоўны ўрач Гродзенскай абласной інфекцыйнай бальніцы, прыняла ўдзел у сесіі Слонімскага раённага Савета дэпутатаў.

Падчас яе былі разгледжаны пытанні аб эфектыўнасці выкарыстання аб'ектаў нерухомай маёмасці дзяржаўнымі арганізацыямі раённай камунальнай уласнасці і гаспадарчымі таварыствамі з доляй Слонімскага раёна ў статутным фондзе, а таксама захады, якія прымаюцца мясцовымі органамі кіравання па ўключэнні ў гаспадарчы абарот, маёмасці, якая не выкарыстоўваецца.

Акрамя таго, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Васіль Маркевіч, генеральны дырэктар птушкафабрыкі «Дружба», прыняў удзел у пасяджэнні Жамчужненскага сельскага выканаўчага камітэта Баранавіцкага раёна. Былі разгледжаны пытанні арганізацыі на тэрыторыі сельсавета работы па рэалізацыі Дэкрэта Прэзідэнта №18 «Аб дадатковых мерах па дзяржаўнай абароне дзяцей у неўладкаваных сем'ях», а таксама прыняцця грамадзян на ўлік для паляпшэння жыллёвых умоў, выдзялення жыхарам участкаў для вядзення асабістых падсобных гаспадарак.

НА ВЫШЭЙШЫМ УЗРОЎНІ

ЗРОБЛЕНА МНОГА. АЛЕ ГЭТАГА МАЛА

Ключавой падзеяй Форуму рэгіёнаў стала пленарнае пасяджэнне з удзелам кіраўнікоў дзяржаў

Аснова інтэграцыі — імкненне народаў да яднання. Гэта — першаснае. Мы можам бясконца казаць пра бар'еры і іх зняцце, пра недапрацоўкі і дасягненні, але калі ёсць жаданне, ёсць воля людзей працягваць сумесную працу — значыць, нездарма была створана Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Пра гэта, а таксама эканамічныя, палітычныя, сацыяльныя і культурныя пытанні ішла гаворка падчас пленарнага пасяджэння IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Фота БЕЛТА.

За рэгіёнамі — перспектыва інтэграцыі

Па словах Аляксандра Лукашэнка, у тым, што мы супрацоўнічаем з Расіяй, ёсць вялізныя магчымасці і рэсурсы. «І ў гэтым выключна важную ролю іграюць рэгіёны. Падкрэслю — незалежна ад геаграфічнай аддаленасці, ўсе расійскія рэгіёны для нас блізкія», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. «Мы спадзяёмся, што і да беларусаў у Расіі будуць ставіцца сапраўды гэтак, усюды. Пакуль мы праблем у гэтых адносінах не маем. Мы адно аднаго не палохаем, мы едзем адно да аднаго, як браты, як родныя. І гэта на ўзроўні людзей, а не толькі нашых размоў з высокіх трыбун. Ці гэта пытанні сацыяльных гарантый і правоў грамадзян, ці паставак беларускай тэхнікі, сельскагаспадарчай прадукцыі, навуковых распрацовак, паслуг».

Менавіта такі падыход дазволіць дзвюм дзяржавам не толькі дасягнуць сучаснага ўзроўню тэхналагічнага развіцця, але і — самае галоўнае — захаваць адзінства і ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Пры гэтым важнае месца ў развіцці двухбаковага ўзаемадзеяння належыць міжрэгіянальнаму супрацоўніцтву. Аляксандр Лукашэнка дадаў, што правядзенне штогод такіх мерапрыемстваў, як форум, дазваляе падтрымліваць пастаянныя сувязі паміж прадстаўнікамі найвышэйшых і мясцовых органаў улады дзвюх краін. Да цяперашняга моманту дзейнічае 70 пагадненняў на ўзроўні ўрада Беларусі і адміністрацый суб'ектаў Расійскай Федэрацыі. Кожнае з іх суправаджаецца канкрэтнай праграмай мерапрыемстваў на трох-чатырохгадовы перыяд.

Прытым важным пунктам сумеснага росту застаецца сфера высокіх тэхналогій. Кантакты ў ёй, лічыць Прэзідэнт, маглі б развівацца больш дынамічна на тых пляцоўках, якія ўжо даказалі сваю эфектыўнасць. «Напрыклад, на базе шырока вядомага Парка высокіх тэхналогій у Мінску», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што мабільнымі праграмамі кампаній-рэзідэнтаў ПВТ сёння карыстаюцца больш за 1 млрд чалавек у 193 краінах, звыш 90% створанага ў Парку праграмнага забеспячэння ідзе на экспарт у Расію і СНД, краіны Заходняй Еўропы і ЗША.

Адказаць на тэхналагічныя выклікі

У сваю чаргу Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі, падкрэсліў значнасць супрацоўніцтва ў высокатэхналагічных сферах. Бо сёння фарміруецца новы прамысловы ўклад, заснаваны на актыўным укараненні лічбавых тэхналогій, інавацыйных матэрыялаў, рабатызацыі, «зялёнай» энергетыцы. «І ад таго, як мы з вамі зможам адказаць на гэтыя тэхналагічныя выклікі, будзе залежаць доўгатэрміновая канкурэнтаздольнасць нашых краін, іх пазіцыі ў глабальным падзеле працы. Дазволю сабе нават больш сказаць: ад таго, як мы вырашым гэтую задачу, будзе залежыць — у значнай ступені — наш лёс. Таму трэба нарошчваць нашы намаганні па стварэнні сумесных высокатэхналагічных прамысловых кластараў, інжынірынгавых цэнтраў, выбудоўваць гнуткія кааперацыйныя ланцужкі для вытворчасці навукаёмістай прадукцыі, якая адпавядае самым высокім сусветным стандартам».

Пры гэтым Уладзімір Пуцін падкрэсліў, што Беларусь і Расія валодаюць значнымі кадравымі, інтэлектуальнымі і адукацыйнымі рэсурсамі. А вядучым расійскім і беларускім кампаніям і ўніверсітэтам па сілах распрацоўваць унікальныя тэхналагічныя і праграмныя прадукты, якія маглі б канкурыраваць на сусветных рынках. «Расія гатова да самага цеснага супрацоўніцтва з партнёрамі з Беларусі для забеспячэння ўстойлівага, доўгатэрміновага росту нашых эканомік», — сказаў Прэзідэнт Расіі.

Не толькі пра дасягненні

У сваю чаргу Міхаіл Мясніковіч, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, нагадаў пра значнасць уніфікацыі, гарманізацыі нацыянальных заканадаўстваў, масавае стварэнне сумесных кампаній, адкрыццё саюзных праграм і праектаў з узаемным допускам суб'ектаў у гэтыя праграмы. «Поспеху ў гэтай справе будуць садзейнічаць абсалютны давер бакоў, захаванне прынцыпаў маральнасці і ўзаемнай павагі», — адзначыў сенатар.

Пры гэтым тут ужо шмат зроблена. Але разам з тым выклікаюць занепакоенасць факты прыняцця прававых актаў у аднабаковым парадку або парушэння прававпрымяняльнай практыкі, якія «часта супярэчаць мэтам будаўніцтва Саюзнай дзяржавы і ствараюць няроўныя ўмовы для беларускіх суб'ектаў гаспадарання на адзінай беларуска-расійскай прасторы».

«Прыкладаў нядобрасумленнай канкурэнцыі і неабгрунтаванага бюракратызму нямала. Гаворка не ідзе пра ўступкі і прэферэнцыі для беларускага боку. Але нарматыўна-прававыя акты, якія прымаюцца ў Беларусі і Расіі, павінны рэальна забяспечваць стварэнне і функцыянаванне адзінай эканамічнай прасторы і прававых асноў агульнага рынку, роўных правоў грамадзян», — канстатаваў Міхаіл Мясніковіч.

У сваю чаргу Валянціна Мацвіенка адзначыла, што эфектыўнае супрацоўніцтва Беларусі і Расіі пабудавана па ўсіх магчымых напрамках. «Беларусь — галоўны партнёр Расіі сярод краін СНД, — заявіла яна. — І хоць вынікі першага квартала бягучага года выклікаюць пэўны аптымізм, аднак пакуль сітуацыя застаецца не такой, як хацелася б».

МАНІТОРЫНГУ БЫЦЬ

ЧАС ВЫПРАБОЎВАЕ ДАКУМЕНТЫ

Ці будуць унесеныя змены ў Дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы?

Чацвёрты раз адбылося пасяджэнне міжпарламенцкай камісіі верхніх палат беларускага і расійскага парламента па міжрэгіянальным супрацоўніцтве. Па выніках яго члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі дамовіліся правесці маніторынг выканання дагавора аб стварэнні Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі і адпаведнасці яму нацыянальных заканадаўстваў.

«Мэта гэтага маніторынгу — паглядзець, што выконваецца, што не выконваецца. Бо дагавор аб стварэнні Саюзнай дзяржавы ні разу не пераглядаўся. За гэты час нешта страціла сваю актуальнасць, штосьці ўжо выконваць не трэба. Гэтыя пункты неабходна ўжо скасаваць. Ці ўключыць нейкія новыя пункты, каб узбагаціць гэты дагавор», — лічыць Мар'яна Шчоткіна, намеснік старшыні Савета Рэспублікі.

Пры гэтым віцэ-спікер адзначыла, што казаць пра тое, што ў дагавор могуць быць унесены змены, заўчасна: «Давайце казаць пра тое, што магчымая выпрацоўка прапаноў па карэкціроўцы, якія будуць пакладзены ў аснову далейшай працы», — сказала яна. Маніторынг плануецца правесці сумесна з Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы.

Акрамя таго, на пасяджэнні быў разгледжаны вынік экспертызы нацыянальных заканадаўстваў Беларусі і Расіі ў галіне правядзення скаардынаванай прамысловай палітыкі. Былі выяўлены не толькі праблемы, але і шляхі іх вырашэння.

Пакуль пасяджэнні міжпарламенцкай камісіі праходзяць раз на год падчас Форуму рэгіёнаў, аднак не выключана, што ў далейшым такія сустрэчы будуць адбывацца часцей.

Матэрыялы падрыхтавала Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

РОБАТЫ, СПАДАРОЖНІКІ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі Аляксандр ШУМІЛІН паведаміў, што «ўжо паставілі такі транспарт для доследнай эксплуатацыі, цяпер прапрацоўваецца пытанне аб пастаўках у Маскву партыі электробусаў з перспектывай выхаду ў іншыя рэгіёны Расіі».

Кіраўнік ДКНТ таксама адзначыў, што галоўная перавага электробуса ў яго экалагічнасці. «Электробусы не забруджваюць навакольнае асяроддзе. Яны не прывязаныя правадамі да маршруту, зараджаюцца на станцыі 5–7 хвілін, а паміж прыпынкамі курсіруюць на электрычнай хадзе», – сказаў ён і дадаў, што да верасня будзе прадстаўлены першы ўзор беларускага электрамабіля.

Фота БЕЛТА.

Яшчэ адзін стэнд – ужо традыцыйна – прысвечаны Нацыянальнай акадэміі навук. На ім увагу прыцягвае інфармацыя, прысвечаная беларуска-расійскаму спадарожніку. «У рамках форуму быў падпісаны мемарандум паміж Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі і Раскосмасам аб арганізацыі работ па новым касмічным апараце. Такім чынам стала фактычна зафіксавана, што мы робім спадарожнік разам», – расказаў журналістам **дырэктар прадпрыемства «Геаінфармацыйныя сістэмы» НАН Беларусі, галоўны канструктар беларускай сістэмы дыстанцыйнага зандзіравання зямлі Сяргей ЗАЛАТЫ.** Ён прызнаўся, што работа па праекце ўжо вядзецца.

Да таго ж не выключана, што да стварэння новага апарата будуць прыцягнутыя прыватныя інвестыцыі, адпаведная цікавасць ужо ёсць. Напрыклад, у ЗША каля 70–80% рэсурсаў на спадарожнік накіроўвае дзяржава, а 20% – камерцыялізуецца. Апарат ствараецца каля чатырох гадоў, 7-8 працуе на арбіце. «Таму прыватны капітал разглядае гэта як рызыкоўныя праекты», – растлумачыў навуковец. У той жа час рынак дыстанцыйнага зандзіравання зямлі павінен расці, прагназуе ён, бо інфармацыя са спадарожнікаў будзе запатрабавана не ў адной галіне народнай гаспадаркі. Таму, магчыма, такая прапанова і зацікавіць прыватнікаў. Новы спадарожнік плануецца запусціць ў 2021 годзе.

Яшчэ адзін стэнд, побач з якім нельга было не затрымацца, – Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі. Хлопцы і дзяўчаты сапраўды пашчыравалі, што ацанілі і Міхаіл Мясніковіч, і Валянціна Мацвіенка. У маладзёжным беларускім кластары прадстаўлены фіналісты і прызёры праекта «100 ідэй для Беларусі», які падчас форуму было прапанавана пашырыць да маштабаў Саюзнай дзяржавы. Больш за ўсё месца займае апарат, у якім ідэальнымі радкамі высаджана ў глебу салата. Механізм здольны не толькі самастойна пасадзіць расліну, паліць яе, але і прыбраць пустазелле, якое раптам вырасце. Таксама тут жа – пальчатка-трэнажор, створаная на 3D-прынтары, якая дапамагае распрацоўваць дробную маторыку рук пасля інсульту.

А яшчэ на выстаўцы былі прадстаўлены дасягненні ў сферы біятэхналогіі, мікраэлектронікі, машынабудавання, хімічныя і нафтахімічныя распрацоўкі, найлепшае ў сферы аховы здароўя і кнігавыданні. Тут можна было хадзіць гадзінамі, разглядаючы кожны стэнд. Але самае галоўнае, што ўсе гэтыя напрацоўкі – беларускія. А значыць, карысць прынясуць перш за ўсё роднай зямлі.

Уладзімір УЛАХОВІЧ, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:

– Беларускія інавацыі выклікалі вялікую цікавасць у наведвальнікаў тэхналагічнай выстаўкі. На ёй былі прадстаўлены перспектыўныя прыклады тэхнікі і тэхналогій у медыцыне, навуцы, прамысловасці, сельскай гаспадарцы, IT-сферы. Наведвальнікі цікавіліся такімі беларускімі распрацоўкамі, як пальчатка-трэнажор для рэабілітацыі пасля інсульту, 3D-люстэрка, робатам-агароднікам, сістэмай дыстанцыйнага зандзіравання зямлі. У экспазіцыю ўвайшоў і беларускі электробус. Усяго ў экспазіцыі бяруць удзел 84 беларускія арганізацыі, якія прадставілі больш за 250 распрацовак.

МЕРКАВАННІ

Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:

– Наша традыцыя праводзіць Форум рэгіёнаў мае важнае значэнне. Форум стаў рэальнай пляцоўкай для ўмацавання дружалюбных і партнёрскіх сувязяў, вырашэння канкрэтных пытанняў, даказаў сваю запатрабаванасць і грунтоўнасць у якасці актыўнага механізма нарошчвання міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння. Сувязі па лініі рэгіёнаў становяцца рэальнай рухаючай сілай і напаўняюць канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы.

Хачу падкрэсліць, што развіццё супрацоўніцтва з Расійскай Федэрацыяй з'яўляецца адным са знешнепалітычных прыярытэтаў нашай краіны. Больш за дваццаць гадоў прайшло са стварэння Саюзнай дзяржавы. Хоць калі глядзець глыбока, то нашы зносіны ніколі не спыняліся. І сёння я ўпэўнены, што і беларусы, і расіяне адчуваюць сябе ў нашых краінах аднолькава камфортна.

Супрацоўніцтва Беларусі і Расіі дазволіла не толькі вырашыць шэраг праблем, якія ўтварыліся пасля распаду СССР, але і стварыць пэўныя ўмовы для збліжэння правоў і свабод грамадзян, умацавання эканамічных сувязяў суб'ектаў гаспадарання. І ў гэтым вялікая заслуга рэгіёнаў нашых краін.

Хачу адзначыць, што наша супрацоўніцтва не абмяжоўваецца рамкамі форуму. Толькі ў гэтым годзе Беларусь наведалі 29 дэлегацый расійскіх рэгіёнаў, у тым ліку 6 – на чале з губернатарамі. Праведзена 17 сумесных пасяджэнняў двухбаковых саветаў, камісій, рабочых груп па супрацоўніцтве з Рэспублікай Башкартастан, Пермскім і Стаўрапольскім краямі, Бранскай, Валагодскай, Мурманскай, Ніжагародскай, Арэнбургскай, Растоўскай, Разанскай, Самарскай, Свярдлоўскай, Смаленскай і Тульскай абласцямі, горадам Масквой.

Уладзімір ЗІНОЎСКІ, міністр эканомікі Беларусі:



– Навукова-тэхнічнае і інавацыйнае супрацоўніцтва – гэта наша будучыня. Створаны сумесна інавацыйны прадукт праб'е любыя бар'еры, і ў ім цікавасць нашых дзвюх дзяржаў. У Еўразійскім эканамічным саюзе краіны падтрымалі стварэнне 12 інавацыйных тэхналагічных платформаў у сферы біятэхналогій, святлодыёдаў, медыцыны і іншых перспектыўных напрамкаў. Гэта рэальныя пляцоўкі для камерцыялізацыі вынікаў навуковых работ і даследаванняў. Таксама ажыццяўляецца падрыхтоўка трох пілотных праектаў у галіне космасу, фармацэўтыкі і аграпрама.

ДЫСКУСІЯ

ІНАВАЦЫІ Ў ДЗЕЯННІ

Не толькі стварыць, але і адаптаваць іх да жыцця заклікалі ўдзельнікі форуму

Якім чынам можна прастымуляваць развіццё высокатэхналагічных вытворчасцяў Расіі і Беларусі? Як забяспечыць рост да 2020 года ўдзельнай вагі экспарту навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі ў агульным аб'еме экспарту нашых краін? Ці да канца выкарыстоўваецца патэнцыял «разумнай» эканомікі? Адказы на гэтыя пытанні шукалі ўдзельнікі секцыі №1 Форуму рэгіёнаў. Уладзімір Панцюхоў, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, мадэрыраваў работу секцыі.

Магчымасці, якімі... не карыстаюцца

Сёння па экспертнай ацэнцы высокатэхналагічны сектар эканомікі Беларусі прадстаўляюць каля 700 арганізацый – яны ажыццяўляюць распрацоўку і вытворчасць інавацыйнай (навукаёмістай) і высокатэхналагічнай прадукцыі і паслуг. Па словах **Дзмітрыя КРУПСКАГА, начальніка ўпраўлення эканомікі інавацыйнай дзейнасці Міністэрства эканомікі Беларусі,** у гэтых кампаніях занята больш за 80 тысяч працуючых, што складае 1,87% ад агульнай колькасці занятых у нацыянальнай эканоміцы краіны. Гэтыя параметры не забяспечваюць яшчэ той «крытычнай масы», якая дазволіла б перавесці Рэспубліку Беларусь на шлях інавацыйнага развіцця.

Па словах Дзмітрыя Крупскага, з моманту абвяшчэння ў 2007 годзе кіраўніцтвам краіны курсу на інавацыйнае развіццё сфарміравана нарматыўна-прававая база, якая ўключае поўны спектр інструментаў для стымулявання высокатэхналагічнага сектара. Гэта сродкі інавацыйных фондаў, займы, інавацыйныя ваўчары і гранты, бюджэтныя сродкі і, адпаведна, ільготы па аплаце падатку на прыбытак і інш.

«Разам з тым, як паказвае практыка, большасць суб'ектаў гаспадарання ў сілу недасведчанасці і недастатковай кампетэнтнасці персаналу практычна не выкарыстоўваюць ні прамыя, ні ўскосныя інструменты падтрымкі, – дзеліцца досведам Дзмітрый Крупскі. – У выніку сёння толькі парадку 300 арганізацый ажыццяўляюць распрацоўку і вытворчасць інавацыйнай і высокатэхналагічнай прадукцыі і паслуг, карыстаюцца такімі інструментамі. Гэта ўсяго 0,26% ад агульнай колькасці суб'ектаў малога, сярэдняга і буйнога бізнесу, зарэгістраванага ў Беларусі».

Няўжо ім не трэба?

Пра тое, які патэнцыял ёсць у супрацоўніцтве беларускіх рэгіёнаў, у прыватнасці Магілёўскай вобласці, з расійскімі, удзельнікам секцыі паведаміў **Віктар НЕКРАШЭВІЧ, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама.** Ён звярнуўся да вынікаў работы нацыянальнага Парка высокіх тэхналогій.

Аказваецца, толькі 10% яго паслуг спажываецца расійскімі кампаніямі. «Няўжо ім не трэба аптымізаваць свае вытворчыя працэсы? – задаецца пытаннем Віктар Некрашэвіч. – У рэшце рэшт, IT-рашэнні закліканы змяншаць выдаткі ў любой сферы. Добра, калі буйная кампанія здольная ўтрымліваць сваю лабараторыю або канструктарскае бюро. Але калі няма такой магчымасці, то неабходна скарыстацца распрацоўкамі навуковых арганізацый, якія сёння шырока прадстаўлены ў нашай краіне».

Для таго каб пацвердзіць магчымасці свайго рэгіёна, Віктар Некрашэвіч прывёў станоўчы прыклад інтэграцыі нашых краін з боку рэальнага сектара эканомікі. Гэта высокатэхналагічная група кампаній «Омск Карбон Груп», якая ўваходзіць у дзясятку найбуйнейшых вытворцаў тэхнічнага вугляроду ў свеце і з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам у Расіі і краінах СНД. Іх новая вытворчасць у Магілёве будзе арыентавана ў першую чаргу на беларускі завод Белшына, а таксама на шыннікаў Еўрасаюза.

Сакрэт – у чалавечым рэсурсе

Але для таго, каб любы эканамічны механізм працаваў, патрэбны чалавечы рэсурс – кваліфікаваныя кадры. Толькі дзе іх сёння ўзяць? **Ігар САЗОНАЎ, рэктар Беларуска-Расійскага ўніверсітэта,** лічыць, што ва ўмовах рынкавай эканомікі трэба разумець, што якасць падрыхтоўкі спецыялістаў праяўляецца ў працэсе выкарыстання. «Выпускнік павінен стаць суцэльнай асобай з сістэмным мысленнем, які можа ў любой справе адкінуць усё малазначнае і хутка дабрацца да галоўнага», – кажа ён.

Для таго каб узровень адаптаванасці да патрэб работадаўцы адпавядаў неабходнаму, у ВНУ ўжываюць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі: модульна-рэйтынгавую сістэму ацэнкі бягучай паспяховасці студэнтаў, інтэрнэт-тэсціраванне іх ведаў незалежным расійскім органам маніторынгу якасці адукацыі. «Выкарыстоўваем і электронныя адукацыйныя рэсурсы, дыстанцыйную адукацыю, укаранілі сістэму менеджменту якасці і інш. Гэта дазволіла скараціць час адаптацыі выпускніка ў рэальным сектары эканомікі і павысіць яго канкурэнтнасць на рынку працы», – паведаміў Ігар Сазонаў.

Па словах Уладзіміра Панцюхова, у большасці выступоўцы адшукалі адлюстраванне сваіх ідэй у праекце рэкамендацый секцыі. «Пяць з іх увайшлі ў праект выніковага дакумента IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі», – падсумаваў старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі.

МЕРКАВАННІ

Лілія АНАНІЧ, міністр інфармацыі Беларусі:

— Большасць маладых людзей сёння атрымліваюць інфармацыю ў інтэрнэце. Якая гэта інфармацыя, да чаго там заклікаюць, якія каштоўнасці прывіваюцца — гэта пытанні, актуальныя для ўсіх нас. Наша агульная задача ў тым, каб інфармацыя была накіравана на інтэграцыйныя працэсы. Пры гэтым інтэграцыйныя ў плане разумення, што беларусы і расіяне ментальна і гістарычна блізкія і родныя людзі і народы. Мы павінны не згубіць важнае: што разам мы мацнейшыя, што беларуска-расійская эканамічная прастора — гэта карысць, што рэалізацыя нашых сумесных інфармацыйных праектаў накіравана не проста на абмен інфармацыяй, а на выбудоўванне трывалай будучыні нашых народаў.

Алег РУМО, член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, кіраўнік Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра трансплантацыі органаў і тканак:

— Беларусь здзейсніла істотны скачок наперад у транспланталогіі. Калі казаць пра ўзровень развіцця донарства, то ў нашай краіне ён складае 23,2 на 1 мільён насельніцтва, у Расіі — 3,3 на 1 мільён насельніцтва. У Расіі ёсць рэгіёны, якія размешчаны побач з намі, — Масква і Маскоўская вобласць, Санкт-Пецярбург, дзе ўзровень развіцця донарства складае прыкладна 14—15 на 1 мільён насельніцтва. І тут у нас добрыя перспектывы для супрацоўніцтва

Калі мы аб'яднаем нашы намаганні з пункту гледжання стварэння каардынуючага цэнтра — наднацыянальнай сістэмы донарства органаў і іх трансплантацыі, які будзе дапамагаць пацыентам у складанай сітуацыі, калі орган патрэбен сёння ці цяпер, то гэта будзе першым крокам для фарміравання такой наднацыянальнай сістэмы, якая існуе ў Еўропе альбо, напрыклад, паміж Скандынаўскімі краінамі. Калі расійскі бок падтрымае гэтую ініцыятыву, то гэты праект стане добрым узорам інтэграцыі дзвюх краін. Гэта важны аспект, які будзе аб'ядноўваць нашы народы.

РЭГІЁНЫ

НЕ ГАНДЛЕМ АДЗІНЫМ

Спікеры верхніх палат сустрэліся з губернатарамі і старшынямі выканкамаў

Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі — гэта ўнікальная пляцоўка для сустрэчы не толькі дзелавых колаў з усіх куткоў нашых краін, але і непасрэдна ўлад. На палях мерапрыемства за некалькі гадзін да пленарнага пасяджэння адбылася сустрэча старшыні Савета Рэспублікі Міхаіла Мясніковіча і старшыні Савета Федэрацыі Валянціны Мацвіенкі з кіраўнікамі рэгіёнаў Рэспублікі Беларусь і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

Фота БЕЛТА.

«Мы не павінны спыняцца ў развіцці, а павінны выкарыстоўваць новыя формы работы, якія будуць садзейнічаць павышэнню канкурэнтаздольнасці нашых эканомік», — заявіў спікер верхняй палаты беларускага парламента. Гэтаму ў тым ліку садзейнічае і правядзенне такіх мерапрыемстваў, як Форум рэгіёнаў, лічыць Міхаіл Мясніковіч.

Пры гэтым Валянціна Мацвіенка адзначыла, што сучасныя ўмовы развіцця сусветнай эканомікі патрабуюць ад краін новых падыходаў ва ўзаемадзеянні, і Беларусі, і Расіі яны якраз і патрэбны. На яе думку, дзвюм краінам неабходна пераходзіць ад гандлёвага супрацоўніцтва да рэалізацыі новых перспектыўных сумесных праектаў і стварэння сумесных вытворчасцяў. Старшыня Савета Федэрацыі лічыць, што паміж рэгіёнамі Беларусі і Расіі дзейнічае мноства пагадненняў аб супрацоўніцтве, але не ўсе з іх выконваюцца. Таму варта актуалізаваць дакументы аб партнёрстве і пры неабходнасці дапоўніць іх планамі на перспектыву. Важна, каб сінхранізацыя заканадаўстваў дзвюх краін магла б сапраўды зняць многія пытанні, заўважыла Валянціна Мацвіенка і прапанавала ўдзяліць гэтай тэме асаблівую ўвагу.

На мерапрыемстве таксама абмяркоўвалася і тэма стварэння беларускага квартала ў Санкт-Пецярбургу. Пра гэта паведаміў губернатар паўночнай расійскай сталіцы Георгій Палтаўчанка і дадаў, што за сродкі гарадскога бюджэту праводзіцца конкурс на найлепшае архітэктурна-планіровачнае аблічча будучага беларускага квартала, і пасля там будуць працаваць менавіта беларускія будаўнікі. У той жа час губернатар канстатаваў, што асобныя бюракратычныя бар'еры ў заканадаўстве тармозяць рэалізацыю праекта. «Раз мы працуем сумесна над прарыўнымі праектамі, у нас і заканадаўства павінна быць адпаведнае», — падкрэсліў ён.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

«ДАМАШНЯЕ ЗАДАННЕ» Ў ЗАКАНАТВОРЧАЙ СФЕРЫ

Падчас работы форуму тэма адной з секцый была прысвечана стасункам паміж рэгіёнамі

Вынікі супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы за 20 гадоў, перспектыўныя кірункі супрацоўніцтва ў сферы эканамічных адносін, роля гарадоў і раёнаў ва ўмацаванні сувязяў паміж рэгіёнамі нашых краін, забеспячэнне роўных правоў грамадзян дзвюх дзяржаў... Гэтыя і іншыя пытанні былі разгледжаны падчас работы секцыі «Ад рэгіянальнага супрацоўніцтва Беларусі і Расіі да супрацоўніцтва гарадоў і раёнаў: новыя магчымасці і перспектывы», што адбылася падчас IV Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

— Выконваючы даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, сталі актыўна супрацоўнічаць і нашы прадстаўнічыя органы — Саветы дэпутатаў у Беларусі, заканадаўчыя сходы і абласныя Думы — у рэгіёнах Расіі. Вынікам такога ўзаемадзеяння сталі пагадненні аб супрацоўніцтве паміж рэгіёнамі, планы мерапрыемстваў, якіх толькі ў гэтым годзе было падпісана больш за 40, — паведаміў **Аляксандр ПАПКОЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, мадэратар секцыі ад беларускага боку.**

Па яго словах, такое супрацоўніцтва дае і эканамічны эфект. Так, у студзені — красавіку гэтага года аб'ём узаемнага гандлю таварамі з Расіяй склаў $9,6 млрд і ў параўнанні з адпаведным перыядам 2016-га павялічыўся на 26,6%. У 2017-м гандаль ажыццяўляўся з 79 расійскімі рэгіёнамі, пры гэтым Беларусь экспартавала прадукцыю ў 79 рэгіёнаў і імпартавала тавары з 75 рэгіёнаў.

У «дзясятку» лідараў, якія імпартуюць тавары з Беларусі, традыцыйна ўваходзяць Маскоўская вобласць, Масква, Смаленская вобласць, Санкт-Пецярбург, Бранская і Кемераўская вобласці, Рэспубліка Татарстан, Краснадарскі край, Ніжагародская і Ленінградская вобласці. На іх долю прыпадала 72,5% беларускага экспарту ў Расійскую Федэрацыю. У сваю чаргу, у «дзясятку» лідараў, якія пастаўляюць тавары ў Беларусь, увайшлі Цюменская, Смаленская і Маскоўская вобласці, Масква, Рэспубліка Татарстан, Санкт-Пецярбург, Пермскі край, Арэнбургская, Ленінградская і Ніжагародская вобласці. На іх долю прыпадала 74,4% расійскага імпарту ў нашу краіну .

— І здаецца, усё добра. Але давайце быць сумленнымі перад самімі сабой: не такога выніку мы чакалі ад Саюзнай дзяржавы 20 гадоў таму. Дзіўная сітуацыя атрымліваецца: на міжнародных пляцоўках — мы адно за аднаго гарой, а як толькі вяртаемся дадому — адразу пра ўсё забываемся. Таму нашы рэгіёны, раёны, гарады, сельскія паселішчы проста абавязаны, можна нават сказаць, асуджаныя стаць сувязным звяном паміж нашымі дзяржавамі, — лічыць Аляксандр Папкоў. — Супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі нашых краін павінна стаць рэальнай рухаючай сілай і напоўніць канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы. Мы абавязаны вырашаць задачы на перспектыву, пашыраць інвестыцыйнае супрацоўніцтва, пераходзіць ад простага гандлю да больш эфектыўных доўгатэрміновых і высокатэхналагічных формаў работы, умацоўваць узаемавыгадныя адносіны паміж рэгіёнамі.

А для гэтага, вядома ж, патрэбны маштабныя сумесныя праекты. Так, на думку беларускага сенатара, саюзныя праграмы з'яўляюцца дзейснай формай узаемадзеяння для рэалізацыі патэнцыялу нашых краін. Аднак удзел галіновых дзяржаўных органаў у фарміраванні адзінай навукова-тэхналагічнай прасторы Саюзнай дзяржавы не ў поўнай меры адпавядае магчымасцям іх навукова-тэхнічных і інавацыйных патэнцыялаў.

— Саюзная дзяржава — гэта не толькі міжнародныя дагаворы і пагадненні, не толькі тэрыторыі, прамысловыя аб'екты, фінансавыя патокі і інвестыцыі. Гэта ў першую чаргу людзі. Беларусь і Расія павінны быць стабільнымі і квітнеючымі не толькі ў буйных гарадах. Наша глабальная мэта — каб кожны населены пункт, кожная, самая маленькая вёска былі добраўпарадкаванымі і давалі магчымасць жыць на годным узроўні. Рэгіёны не атрымаюць развіцця, пакуль туды не прыедуць людзі. Чалавечы фактар у гэтым выпадку адыгрывае вырашальную ролю, — упэўнены сенатар.

Паміж калегіяльнымі органамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі па выніках работы секцыі былі падпісаны наступныя пагадненні:

✓ *Пратакол аб супрацоўніцтве паміж Саюзам расійскіх гарадоў (Расійская Федэрацыя) і Саветам па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь;*

✓ *Пагадненне паміж Брэсцкім гарадскім Саветам дэпутатаў і гарадской Думай горада Іжэўска Удмурцкай Рэспублікі;*

✓ *Пагадненне паміж Глыбоцкім раёнам Віцебскай вобласці Рэспублікі Беларусь і Астроўскім раёнам Пскоўскай вобласці Расійскай Федэрацыі;*

✓ *Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Віцебскім гарадскім выканаўчым камітэтам Рэспублікі Беларусь і адміністрацыяй горада Іркуцк Расійскай Федэрацыі.*

У сваю чаргу **Дзмітрый АЗАРАЎ, старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па федэратыўным уладкаванні, рэгіянальнай палітыцы, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы,** адзначыў, што тэма секцыі была выбрана не выпадкова. І работа па абмене вопытам у сферы мясцовай улады паміж Беларуссю і Расіяй актывізоўвалася на працягу ўсяго мінулага года, з трэцяга Форуму рэгіёнаў. «І гэта вельмі карысны вопыт. Мы ўжо дамовіліся з маім беларускім калегам Аляксандрам Папковым, што на наступны год выбудуем нашу сумесную работу яшчэ больш сістэмна, планава, намецім шэраг мерапрыемстваў, абменаў дэлегацыямі. Але хачу адзначыць, што ўжо ёсць сур'ёзны вопыт міжрэгіянальнага, міжмуніцыпальнага супрацоўніцтва, і нам варта яго развіваць, бо тут увесь патэнцыял не выкарыстаны», — паведаміў ён.

Па словах Дзмітрыя Азарава, шмат пытанняў міжрэгіянальнага супрацоўніцтва ляжыць і ў сферы эканомікі. «Мы можам угаворваць бізнес, што трэба наладжваць партнёрства. Але бізнес працуе там, дзе выгадна. Таму мы як заканадаўцы павінны ствараць спрыяльныя ўмовы для развіцця бізнесу, вытворчай кааперацыі паміж нашымі рэгіёнамі і краінамі. Таму мы пасля секцыі сышлі з дамашнім заданнем у заканатворчай сферы на год наперад», — сказаў ён.

Усяго ў секцыі прынялі ўдзел 140 чалавек: кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі і Расіі, кіраўнікі абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў, старшыні раённых выканаўчых камітэтаў і Саветаў дэпутатаў Рэспублікі Беларусь, старшыні абласных дум, заканадаўчых сходаў Расійскай Федэрацыі, кіраўнікі прадпрыемстваў і арганізацый.

Сярод прапаноў, якія былі сфармуляваны па выніках работы секцыі, прагучалі і такія: пашырыць практыку заключэння пагадненняў аб супрацоўніцтве паміж рэгіянальнымі гандлёва-прамысловымі палатамі Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі, правесці выстаўкі-кірмашы і іншыя мерапрыемствы тавараўтворцаў у рэгіёнах-партнёрах. Акрамя таго, прапаноўвалася аказваць органам мясцовага самакіравання прыгранічных тэрыторый дапамогу ў пашырэнні сеткі гандлёвых дамоў і прадстаўніцтваў, правядзенні выставак-кірмашоў, сумесных культурных і спартыўных мерапрыемстваў. А таксама пашыраць сумесную інвестыцыйную дзейнасць па рэканструкцыі і мадэрнізацыі прамысловых прадпрыемстваў, больш актыўна прымяняць практыку здачы сельскагаспадарчай і іншай тэхнікі ў лізінг, фінансаваць найважнейшыя праекты Саюзнай дзяржавы непасрэдна з бюджэту Саюзнай дзяржавы, забяспечваць адно аднаго інфармацыяй па пытаннях інвестыцыйнай дзейнасці і прыцягнення інвестыцый.

Матэрыялы аб рабоце IV Форуму рэгіёнаў падрыхтавала Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

Добрая звычка

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Дарэчы, адна з версій назвы Бабінавічаў — ад слова «баба» — ком гліны, падрыхтаваны ганчаром для работы над вырабам. Напэўна, было б лагічным стварыць у аграгарадку ганчарны турыстычна-адукацыйны цэнтр. Асабіста бачыў такі ў вёсцы ў латвійскай Латгаліі (на мяжы з Беларуссю). Там у будынку былой школы ганчар зрабіў майстэрню і прымае турыстаў, прадае свае вырабы... Пад рэалізацыю ідэі можна, дарэчы, атрымаць грант. Тым больш што ў Бабінавічах жыў дзед Марка Шагала. Пра апошняе мала хто ведае.

800 РУБЛЁЎ У МЕСЯЦ

Мясцовае лясніцтва таксама актыўна ўдзельнічае ў добраўпарадкаванні. Цэх дрэваапрацоўкі тут аснашчаны сучасным абсталяваннем, якое купілі за 60 тысяч еўра. Працуючы ў 2 змены па 12 гадзін (праз 2 дні) самыя спрытныя ў цэху «брудныміі» зарабляюць па 800 і больш рублёў — для глыбінкі гэта вельмі добры ўзровень аплаты працы.

Жывёлагадоўчы комплекс у вёсцы Асіпенкі спраўна папаўняе казну падаткамі, якія ў тым ліку накіроўваюцца і на добраўпарадкаванне. 470 кароў штодня даюць больш чым па 16 літраў малака. Зарплата ў даярак — да 500 рублёў. Ферма абсталявана сістэмай відэаназірання, добра механізаваная.

Удзельнікам пасяджэння паказалі і аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх састарэлых, вакол якога таксама ідэальны парадак. Унутры будынка, які некалькі гадоў таму рэканструявалі, ёсць усё неабходнае, нават трэнажорная зала.

У школьным музеі ў Бабінавічах (*справа* — старшыня Бабінавіцкага сельскага Савета Вольга МАРЖАЕДАВА).

— У нас жывуць 26 дзядуль і бабуль. Многія актыўна займаюцца добраўпарадкаваннем тэрыторыі. Вядома, што сельскія жыхары прывыклі працаваць на зямлі, для іх у радасць нешта пасадзіць, даглядаць за кветкамі, садавіной і гароднінай, — гаворыць **загадчыца ўстановы Наталля ХАРКЕВІЧ.**

Убачылі народныя выбраннікі і месцы памяці герояў-вызваліцеляў. У прыватнасці, мемарыял «Ціхмянаўская вышыня», які знаходзіцца ў ідэальным стане. Адзін з яго аўтараў — вядомы віцебскі скульптар Азат Тарасян. Мясцовыя комплекс называюць «Курган славы». Гара атрымала назву ў гонар старшага лейтэнанта Ціхмянава, які за гераізм быў удастоены высокага звання Героя Савецкага Саюза.

ДЗЕ ГАСПАДАР, ТАМ І ПАРАДАК

Пасля наведвання аб'ектаў адбылася шчырая размова ўдзельнікаў мерапрыемства з раённай уладай. **Старшыня райвыканкама Іван ЛАЎРЫНОВІЧ** падкрэсліў, што навядзенне парадку — не «акцыя для галачкі». Ад кожнага кіраўніка — сельсавета, арганізацыі, сельскагаспадарчага прадпрыемства патрабуецца, каб добраўпарадкаванне стала добрай звычкай. І на энтузіязме многае можна зрабіць. Напрыклад, у вёсцы Дабрамыслі крыніцу, якая раней больш нагадвала сметнік, ператварылі ў «звычайны цуд». Туды і з Расіі, з якой мяжуе Лёзненшчына, па ваду прыязджаюць. Дарэчы, сярод актывістаў, якія наводзілі прыгажосць, былі і ратавальнікі. **Начальнік раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях Віталь ЧАЙКІН,** дэпутат райсавета, выступаючы на сесіі, сказаў, што працавалі яны з добрым настроем і дзеля патрэбы душы. У вольны час, у выхадныя бяруць рыдлёўкі ў рукі і — уперад!

Аддзяленне кругласутачнага знаходжання адзінокіх састарэлых.

— Насамрэч для навядзення парадку не заўсёды патрабуюцца грошы. Было б толькі жаданне — і многае можна зрабіць; каб дзеці нашы нам потым сказалі «дзякуй», — лічыць старшыня райвыканкама.

Ён заклікаў па-гаспадарску клапаціцца аб кожным метры зямлі. У прыватнасці, у свой час было шмат ахвотных браць зямлю для апрацоўкі. Цяпер сітуацыя змянілася. У старых сілы не тыя, а моладзь за вялікімі ўчасткамі ў чаргу не становіцца. Зямля перадаецца гаспадаркам. Але для іх дробныя надзелы, можна сказаць, «галаўны боль». Выкарыстоўваюцца не так эфектыўна, як хацелася б. Але ў любым выпадку зямля павінна працаваць на эканоміку.

Новыя вытворчасці, прагучала падчас пасяджэння, — гэта дадатковыя падаткі ў мясцовы бюджэт, як і працоўныя месцы, якія павінны адпавядаць патрабаванням часу. Зразумела, ёсць надзея на нядрэнныя заробкі і зноў жа падаткі з іх. А грошы будуць накіроўваць у тым ліку і на добраўпарадкаванне. Такім чынам, прыгажосць і эканоміка працуюць ў «звязцы».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

ФОРМА І ЗМЕСТ

ПАДУМАЛІ І... СТВАРЫЛІ

Асацыяцыя мясцовых Саветаў: дубліруючы орган улады ці новы крок на шляху самакіравання?

Здаецца, недахопу ў дэпутатах у нас няма. Механізм мясцовых Саветаў працуе на ўсіх узроўнях — ад сельскіх да абласных. Але гродзенскія дэпутаты вырашылі стварыць новае фарміраванне — першую ў краіне абласную асацыяцыю мясцовых Саветаў. За два гады тут упэўніліся — новая арганізацыя сваімі захадамі садзейнічае аўтарытэту дэпутацкага корпуса.

Крок да самастойнасці

Выхад на міжнародны ўзровень — такую мэту ставяць перад сабой члены асацыяцыі. Іх зараз больш за 400 — амаль трэцяя частка ўсяго дэпутацкага корпуса Гродзеншчыны. У склад асацыяцыі ўваходзяць прадстаўнікі абласнога, гарадскога, 10 раённых і 38 сельскіх Саветаў. Любы член асацыяцыі можа прадстаўляць інтарэсы Саветаў усіх узроўняў на розных канферэнцыях і форумах, у тым ліку міжнародных. Праз асацыяцыю лягчэй знайсці кантакт з прадстаўніцтвам замежных краін, а таксама прыняць удзел у трансгранічных праграмах.

— Усе міжнародныя органы самакіравання лепш ідуць на кантакт менавіта з асацыяцыямі, бо тут прадстаўлены ўвесь дэпутацкі корпус, — падкрэслівае **старшыня праўлення Гродзенскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў Анатоль НІКІЦІН.** — Калі нейкі праект распачаўся ў сельскім Савеце, яго будзе «цягнуць» уся арганізацыя. Гэта значыць, што ёсць больш шанцаў на поспех.

Пакуль новы кірунак асвойваецца. Але ёсць добрыя перспектывы. Днямі гродзенская асацыяцыя зарэгістравана ў фондзе імя Л. Сапегі, які садзейнічае развіццю мясцовага самакіравання. У Гродне адбудзецца сустрэча з кіраўніком фонду па абмеркаванні сумесных праектаў. Анатоль Нікіцін настроены аптымістычна. На яго думку, асацыяцыя ўжо восенню можа стаць партнёрам міжнародных праектаў, якія накіраваны на ўзнаўленне гістарычных помнікаў, храмаў, сядзіб.

Эскізы падтрымалі

Гродзенцы супрацоўнічаюць з органамі самакіравання Расіі, Украіны, Арменіі. Вынікам гэтага сталі канкрэтныя праекты па ўзнаўленні помнікаў расійскіх генералаў, удзельнікаў вайны 1812 года, якія пахаваны на тэрыторыі вобласці. Так, у Гродне памёр ад ран малады генерал Ланской, якому было толькі 32 гады. Адметны помнік патрабуе рэканструкцыі. Члены асацыяцыі правялі работу па яго абследаванні і заказалі новы праект па аднаўленні агароджы, абліцоўкі, мемарыяльнай дошкі.

Другі праект таксама датычыцца героя вайны 1812 года, генерала Гальперына, які пахаваны ў Зэльве. Эскізы ўзноўленых помнікаў адпраўлены расійскаму боку.

Партнёрам гродзенскай асацыяцыі мясцовых Саветаў стаў маскоўскі музей-панарама «Барадзінская бітва». Менавіта яны выдзяляць сродкі для рэканструкцыі помнікаў, якія па манументальнасці можна паставіць у адзін рад з гістарычнымі аб'ектамі.

— Адзін праект каштуе 7 тыс. долараў, другі — 15 тыс., — паведаміў Анатоль Нікіцін. — Гэтыя грошы паступяць з бюджэту Саюзнай дзяржавы, а мы павінны арганізаваць падрадныя работы.

З асацыяцыяй Арменіі гродзенцы таксама знайшлі агульныя кропкі. Стала вядома, што ў вёсцы Парэчча Слонімскага раёна жылі армяне, якія з'яўляліся прыхаджанамі царквы вялікамучаніка святога Георгія Пабеданосца. У сувязі з гэтым вырашана сумеснымі сіламі правесці рэканструкцыю гэтага храма.

Як генерал-маёр запасу, Анатоль Нікіцін вялікую ўвагу ўдзяляе памяці загінулых у ваенных дзеяннях. У мінулым годзе асацыяцыяй арганізавана работа па добраўпарадкаванні вайсковых могілак — было заменена амаль 80 пліт. Ёсць намер узнавіць усе могілкі, дзе пахаваны і палякі, і немцы, і яўрэі. Да гэтай работы будуць прыцягнуты партнёры замежных краін.

Ігар ЖУК, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:

— Асацыяцыя мясцовых Саветаў створана ў адпаведнасці з законам аб мясцовым кіраванні і самакіраванні. Падобныя фарміраванні ёсць у Польшчы, Літве, Расіі і многіх іншых краінах, у Беларусі гэта першы вопыт падобнай арганізацыі. Галоўная мэта — актыўна садзейнічаць станаўленню і развіццю мясцовага самакіравання.

Не наступаць на граблі

Акрамя міжнароднай дзейнасці, удзяляецца ўвага злабадзённым праблемам у грамадстве. Вопыт найлепшых вывучаецца і абагульняецца. Гэта дапамагае іншым не наступаць на адны і тыя ж граблі. Так, падчас выязнога семінара ў Шчучыне разгледзелі пытанне па ўключэнні ў абарот будынкаў, якія пустуюць, альбо тых, якія выкарыстоўваюцца неэфектыўна.

— Такіх аб'ектаў дастаткова ў кожным раёне, — кажа Анатоль Аляксеевіч, — амаль усе яны знаходзяцца на балансе мясцовых Саветаў. Таму мы разгледзелі, як іх рамантаваць, як змяняць іх прызначэнне, на вопыце найлепшых. Наступны семінар правядзём па тэме развіцця прадпрымальніцтва: як лепш задзейнічаць тэрыторыі, якія слаба выкарыстоўваюцца?

Сабраны матэрыял ляжа ў аснову спецыяльнага дапаможніка. Органы мясцовага самакіравання змогуць карыстацца вопытам адзін аднаго. Будзе зроблены аналіз работы Саветаў — членаў асацыяцыі. Дарэчы, уступіць у новае структурнае падраздзяленне могуць усе мясцовыя Саветы па жаданні. Узносы складаюць адну базавую велічыню ў год. Сельскія Саветы наогул вызвалены ад платы за членства. Таксама ёсць дапамога спонсараў. Напрыклад, зараз на рахунку асацыяцыі 9 тыс. рублёў. Зарабляць грошы ўласнымі сіламі арганізацыя не мае права, бо з'яўляецца некамерцыйнай структурай. Таму акцэнт тут робяць на міжнародныя праекты і гранты.

Значная частка фонду ідзе на дабрачынную дзейнасць. Напрыклад, кадэцкі каледж атрымаў нядаўна камплект аргтэхнікі. Аказваецца дапамога некалькім дзіцячым установам. Першыя вынікі работы асацыяцыі мясцовых Саветаў плануецца падвесці ў канцы года.

— Мы распрацавалі дакументы на званне найлепшага сельскага Савета, камітэта тэрытарыяльнага самакіравання, старасты, — зазначае Анатоль Нікіцін. — Нам зрабілі прызы, іх 20. Будуць граматы, а таксама грашовыя прэміі, да 20 базавых велічынь за тры першыя месцы.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
margo@zviazda.by

ДЛЯ ЛЕПШАЙ ДЫЯГНОСТЫКІ

Дзякуючы грантавай дапамозе ўрада Японіі Брэсцкая абласная і Лунінецкая раённая бальніцы атрымалі новае дыягнастычнае абсталяванне.

— У Лунінецкім раёне 45 населеных пунктаў маюць узровень забруджвання ад 0 да 5 кюры, — расказала **галоўны ўрач цэнтральнай раённай бальніцы Святлана ХЛЕБУС,** — там пражывае 45 тысяч чалавек. І вядома, своечасовы маніторынг стану здароўя насельніцтва — адзін з галоўных клопатаў раённай медыцыны.

Новы апарат ультрагукавой дыягностыкі з наборам інструментаў ужо паспяхова працуе ў стацыянары. На ім даследуюць сэрца, сасуды, малочную і шчытападобную залозы. Абсталяванне характарызуе высокая дакладнасць. Так, рак малочнай залозы можна разгледзець пры памеры пухліны ў 3 мм, рак шчытападобнай залозы — пры пухліне ў 2—3 мм. Пры такім раннім выяўленні хваробы шанцы на паспяховае лячэнне і выздараўленне ўзрастаюць. На ранніх стадыях выяўляюцца таксама паталогіі сэрца і сасудаў.

У Брэсцкую абласную бальніцу паступіў урэтэрарэнафібраскоп. Апарат выкарыстоўваюць для дыягностыкі захворванняў нырак, для лячэння мочакаменнай хваробы.

Агульны кошт абсталявання складае больш за 70 тысяч долараў. Яно закуплена па праграме «Карані травы», якая рэалізуецца ў нашай краіне ўрадам Японіі. За 13 гадоў медыцынскія ўстановы раёнаў, якія пацярпелі ад Чарнобыльскай аварыі, атрымалі больш за дзве сотні адзінак абсталявання.

Цырымонію перадачы абсталявання медустановам Брэстчыны правёў **часовы павераны ў справах Японіі ў Беларусі Хірокі ТАКУНАГА.** Падчас сустрэчы са старшынёй Брэсцкага аблвыканкама Анатолем Лісам дыпламат з удзячнасцю нагадаў, што пасля аварыі на Фукусіме Беларусь падзялілася вопытам па ліквідацыі наступстваў атамнай катастрофы, а таксама паведаміў, што Японія мае намер працягваць праграму «Карані травы».

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by

У ПОЛІ ЗРОКУ

У СПІСАХ НЕ ЗНАЧАЦЦА, АЛЕ ХОДЗЯЦЬ ПА МЯЖЫ

Ці здольны праблемныя сем'і палепшыць умовы пражывання і паводзіны

УСЕ праблемныя сем'і праблемныя па-рознаму, але маюць шмат агульнага — адзначаюць спецыялісты. І гэта агульнае найчасцей мае вадкі стан і пэўны градус. А далей выцякаюць наступствы: есці не наварана, у хаце не прыбрана, дзеці недагледжаныя, а часта і хлеба няма за што купіць.

Такія сем'і, на жаль, цяпер ёсць калі не ў кожнай вёсцы, дык у кожным сельсавеце дакладна. У Маларыцкім раёне 147 дзяцей з 66 сем'яў знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане. Гэта значыць, іх пастаянна кантралююць адпаведныя службы.

Некалькі сем'яў названага спіса пражываюць у Чарнянскім сельсавеце. «Але не толькі іх даводзіцца трымаць пад кантролем, ёсць і іншыя, тыя, хто балансуе паміж нормай і праблемнымі паводзінамі. І калі іх на нейкі час выпускаеш з поля зроку, яны, што называецца, разнявольваюцца», — гаворыць **старшыня сельвыканкама Аляксандр ПЯТРУЧЫК.**

Летась, на жаль, адну шматдзетную маці давялося пазбаўляць бацькоўскіх правоў. За яе сям'ю пэўны час змагаліся, спрабавалі выхоўваць жанчыну, прымаць меры грамадскага ўздзеяння... Спачатку забралі дзяцей на паўгода ў прытулак. Ёй жа паставілі задачы па навядзенні парадку ў хаце, па выпраўленні ўласных паводзін, гэта значыць парэкамендавалі менш налягаць на выпіўку. Але маці пяцярых дзяцей да парад не прыслухоўвалася, гаварыла, што ўсё роўна праз паўгода дзяцей вернуць, а цяпер яна хоць адпачне. Потым, калі чарговы раз кабету строга папярэдзілі, смецце з хаты вынесла, сякі-такі рамонт зрабіла. Дзяцей вярнулі. А праз пару дзён даму заўважылі на вясковай вуліцы ў нецвярозым стане. У дзень, калі старшыня сельскага Савета з прадстаўнікоў аддзела адукацыі наведалі сям'ю, у доме была гулянка, маці сямейства сядзела за сталом з сабутэльнікам. Найбольш абурыла прадстаўнікоў улады харчаванне самага меншага дзіцяці, яшчэ немаўляткі. Малое сядзела ў ложку і ссала малако з паўтаралітровай пластыкавай бутэлькі. Пасудзіна была яўна даўно не мытая, малако на сценках закісла... Дзяцей забралі ў той жа дзень.

> Калі яму за дзесяць прагулаў прызначылі 200 гадзін бясплатнай работы, тады чалавек асэнсаваў нявыгаднасць парушэння працоўнай дысцыпліны.

Праз некаторы час адбыўся суд. Праўда, на судзе жанчына пускала слязу, гаварыла, як любіць дзяцей. Але ёй не паверылі, бо піла і гуляла гора-маці на дзіцячую дапамогу. А цяпер яна абавязаная асоба і павінна кампенсаваць сродкі на ўтрыманне малых. На работу грамадзянку ўладкавалі ў мясцовую гаспадарку.

— Але названая гісторыя ўсё ж выключэнне, — гаворыць Аляксандр Пятручык. — Мы ж імкнёмся зрабіць усё, каб дзеці заставаліся ў сем'ях. За апошні час дзве шматдзетныя сям'і палепшылі жыллёвыя ўмовы, і сітуацыя памянялася ў лепшы бок. Сям'я з дзевяці чалавек Аляксандра і Яўгеніі М. жыла ў адным пакоі. Беспарадак на мяжы антысанітарыі даваў падставу аднесці дзяцей да тых, што знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным стане. Але сям'і выдзелілі дом у суседняй вёсцы. І гэта, можна сказаць, акрыліла шматдзетных бацькоў. У новым доме яны хутка навялі парадак. Прысядзібны ўчастак і двор утрымліваюць амаль узорна. У гэтай сям'і ёсць толькі адно слабае месца: гаспадар часам выпівае. Калі ён цвярозы, працаўнік — пашукаць такога, таму і дом належным чынам трымае, а калі сарвецца... Таму іх таксама варта трымаць пад кантролем.

Пётр ГУБЕЙ, старшыня Маларыцкага раённага Савета дэпутатаў:

— Лічбы, якія прыводзіліся па праблемных сем'ях, маюць адносны характар, бо ўвесь час мяняюцца: адну сям'ю здымаюць з уліку, іншую ставяць... Самае горшае, калі даводзіцца пазбаўляць бацькоў іх правоў і забіраць дзяцей. Ужо ў гэтым годзе суды прынялі рашэнне ў дачыненні да чатырох бацькоў, шасцёра дзяцей атрымалі апекуноў. Значыць, агульная работа ў названых выпадках не дала чаканых вынікаў...

Нядаўна сустракаўся з сям'ёй, якую даўно трымаю ў полі зроку. Бацькі ўсё жыццё злоўжывалі гарэлкай. Двое дзяцей выраслі, атрымалі спецыяльнасці, уладкаваліся на працу, у рот не бяруць спіртнога. Бацька іх самакрытычна заўважыў: «Сам не ведаю, у каго яны ўдаліся». Дакладна, гэтыя дзеці бралі за ўзор не бацькоў. Дык вось, гэты прыклад гаворыць аб тым, што працаваць трэба нават з самымі праблемнымі сем'ямі, калі там растуць дзеці. Некаторыя і не значацца ў спісах, але ходзяць, што называецца, па мяжы. Іх важна пастаянна трымаць пад увагай — такая пазіцыя ў нас са старшынямі сельскіх Саветаў.

Намеснік дырэктара школы Наталля МЯРЧУК і старшыня сельскага Савета Аляксандр ПЯТРУЧЫК.

Намеснік дырэктара Чарнянскай сярэдняй школы Наталля МЯРЧУК гаворыць, што цяпер у дачыненні да бацькоў вучняў з дзвюх названых сем'яў ніякіх нараканняў няма. Дзеці не прапускаюць заняткаў, рыхтуюць урокі, ходзяць у школу акуратна апранутымі. Наогул жа, школа працуе разам з сельскім выканкамам па ўсіх праблемных сем'ях, і на савеце прафілактыкі абавязкова прадстаўнік адміністрацыі школы бывае. І дадому да вучняў настаўнікі зазіраюць.

На саветы прафілактыкі, якія праходзяць у сельвыканкаме, запрашаюць бацькоў праблемных сем'яў, абавязаных асоб, іншыя катэгорыі грамадзян, у якіх ёсць пытанні з паводзінамі. Для некаторых гэтая мера калектыўнага выхавання бывае дзейснай, іншыя фактычна не рэагуюць. Вось, скажам, выклікалі на савет абавязаную асобу Мікалая М. з прычыны нядбайных адносін да працы на рабочым месцы. Ён паслухаў ды пайшоў. А калі яму за дзесяць прагулаў прызначылі 200 гадзін бясплатнай работы, тады чалавек асэнсаваў нявыгаднасць парушэння працоўнай дысцыпліны. Старшыня сельскага Савета лічыць, што ўсе формы прафілактыкі трэба выкарыстоўваць, але найлепшыя вынікі дае індывідуальная работа. Калі заязджаеш у дом, там можна гаварыць прадметна. Бо на савеце прафілактыкі асобныя гаспадыні робяць вялікія вочы і запэўніваюць, што ў іх усё амаль ідэальна. А калі ў хаце ім паказваеш на шэра-чорную пліту, якая некалі была белай, то іншая шматдзетная гаспадыня ўсё ж

Калі яны адчуваюць увагу мясцовай улады, тады і паводзяць сябе больш абачліва.

Яшчэ адна сям'я пражывае ў Чарнянах. Там праблема крыху іншага кшталту. Бацька сямейства, у якім растуць пяцёра дзяцей, мае статус сужыцеля. Ён даволі доўга не мог зарэгістраваць шлюб, бо не меў дакументаў. На час развалу Савецкага Саюза мужчына пражываў у Расіі, потым за нейкае правапарушэнне трапіў у турму, пазней згубіў дакументы. У выніку толькі нядаўна атрымаў від на жыхарства асобы без грамадзянства ў вёсцы, дзе нарадзіўся. Але П. працуе ў мясцовым калгасе, ад

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

абавязкаў па выхаванні дзяцей не ўхіляецца. Сям'я трапіла ў спісы найперш з-за ўмоў пражывання. А цяпер ім далі дом у Чарнянах, і абстаноўка палепшылася. Але і гэтых бацькоў старшыня сельскага Савета лічыць патрэбным трымаць у полі зроку, бо часам гаспадар усё ж прыкладваецца да чаркі.

